Сямейная газета



**«Лятучы клуб» для будучых мам**



**Чым бацькам заняць дзіця?**



**Малеча хлусіць? Справа ў сям'і**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Генадзь БАЛБАТОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва:**

*«Больш за 357,3 тысячы школьнікаў атрымаюць пуцёўкі ў дзіцячыя аздараўленчыя лагеры на летніх канікулах 2017 года. Усе дзеці і падлеткі, якія захочуць адпачыць у лагерах і якія маюць патрэбу ў летнім аздараўленні, атрымаюць такую магчымасць. Агульны аб'ём летняга аздараўлення па рэгіёнах краіны сфарміраваны зыходзячы з заявак установ адукацыі. Так, у летнія месяцы ў лагерах розных тыпаў адпачнуць і ўмацуюць здароўе ў Брэсцкай вобласці 61,5 тыс. школьнікаў, у Віцебскай — 43 620, у Гомельскай — 43 655, у Гродзенскай — 46 760, у Мінскай — 53 620, у Магілёўскай вобласці — 42 тысячы, у Мінску — 66 160 дзяцей і падлеткаў. Памеры датацый на пуцёўкі ў летні перыяд 2017 года павялічаны ў сярэднім на 9%».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.03.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8767 | ▲ |
| Еўра | 2,0242 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0329 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0694 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

17060>

9 771990 763008

Родная газета на родней мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 САКАВІКА 2017 г. ЧАЦВЕР № 60 (28424)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ПРЭЗІДЭНТ НАКІРАВАЎСЯ З АФІЦЫЙНЫМ ВІЗІТАМ У ТУРКМЕНІСТАН



Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з афіцыйным візітам у Туркменістан. Сёння кіраўнік дзяржавы правядзе перагаворы з Прэзідэнтам Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедавым, якія пройдуць у фармаце сам-насам, а затым у пашыраным складзе. Бакі плануюць абмеркаваць шырокі спектр пытанняў, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. Асаблівая ўвага будзе ўдзелена развіццю гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Па выніках перагавораў чакаецца падпісанне шэрагу двухбаковых дакументаў.

Плануецца, што лідары дзвюх краін таксама прымуць удзел у цырымоніі адкрыцця комплексу будынкаў пасольства Беларусі ў Туркменістане.

Заўтра Аляксандр Лукашэнка і Гурбангулы Бердымухамедаў наведаюць Гарлыкскі горна-абагачальны камбінат, будаўніцтва якога было нядаўна завершана беларускім бокам. Кіраўнікі дзяржаў ва ўрачыстай абстаноўцы дадуць старт рабоце завода, а затым азнаёмяцца з вытворчасцю.

# ЦЁПЛАЕ ЗЕРНЕ — ДА ШЧОДРАЙ РАЛЛІ





**На апошніх гектарах вядуць сяўбу яравых збожжавых культур механізатары ААТ «Капаткевічы» Петрыкаўскага раёна. Сяўбу яравых на плошчы 370 га ў гаспадарцы правялі ў кароткі тэрмін — за два тыдні, цяпер вясковыя працаўнікі распачынаюць сяўбу аднагадовых культур, плошча пасеваў складзе 310 га. На здымку: аператар па загрузцы насення Дзмітрый БЯСПАЛЫ.**

Фота БЕЛТА.

■ Рыштаванні Бацькаўшчыны

# КРЭВА. КРАЕВУГОЛЬНЫЯ КАМЯНІ

**Карэспандэнт «Звязды» разабралася ў сітуацыі, якая склалася вакол славутага замка**

**У сярэдзіне сакавіка сеціва абляцелі фотаздымкі Крэўскага замка, на якіх паказана разварочаная вакол яго зямля. Не ўнікнуўшы ў сітуацыю, многія аматары пачалі пісаць, што беларускую гісторыка-культурную каштоўнасць руйнуюць бульдозерамі... Карэспандэнт «Звязды» вырашыла разабрацца, што ж там насамрэч адбываецца. Высветлілася, не так страшны чорт, як яго малююць.**

На замку вялася падрыхтоўка да археалагічных раскопак, таму была выкарыстана цяжкая тэхніка. **Навуковы кіраўнік праекта аднаўлення замка Уладзімір СІНЯЎСКІ** адзначыў:

— Правілы правядзення археалагічных раскопак намі не парушаліся. Мы выкарысталі бульдозеры, каб падняць цяжкія камяні, што ўпалі са сцяны. Гэта патрэбна было для таго, каб пад'ехала буравая вышка і зрабіла свідравіны, неабходныя для даследаванняў. Усе работы мы праводзілі на паверхні, культурны слой не быў парушаны.

СТАР. 4

■ Трэці ўзрост

# ГУРТКІ ДЛЯ ТАНЦОРАЎ І ГУМАРЫСТАЎ

Што тэрытарыяльныя цэнтры могуць прапанаваць пенсіянерам-мужчынам?

**У Еўропе дзённыя цэнтры догляду з гурткамі па інтарэсах лічаць адной з найлепшых форм работы з пажылымі людзьмі. Ёсць, праўда, адзін мінус — да 90 працэнтаў наведнікаў такіх цэнтраў складаюць жанчыны. Дырэктар Міжнароднага інстытута ААН па праблемах старэння насельніцтва (Мальта) Марвін Фармоза лічыць, што прычына не толькі ў тым, што дам у сталым узросце больш. Цэнтры часта не ўлічваюць інтарэсы мужчын, і таму ім некамфортна ў тых гуртках, якія ёсць. А ці ўдаецца беларускім аддзяленням для пажылых задзейнічаць дужую палову і што ім маюць прапанаваць?**

## БУДЗЕ ПОПЫТ — ЗАДАВОЛЯЦЬ

— Мужчын у нас у гуртках для пажылых амаль няма, — прызнаюцца ў Лунінецкім тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. — Спрабавалі іх і ў Лунінцы прыцягнуць, і ў Мікашэвічах (у нас там філіял), але не атрымалася.

СТАР. 3

# АЛЬТЭРНАТЫВА ЯК ГАРАНТ ПОСПЕХУ

## Кіраўнік дзяржавы сустрэўся з прадстаўніком Сусветнага банка

**У гэтым месяцы Палац Незалежнасці ўжо наведвалі прадстаўнікі найбуйнейшых міжнародных банкаўскіх структур — Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця і Міжнароднага валютнага фонду. А ўчора кіраўнік дзяржавы сустрэўся са старшым віцэ-прэзідэнтам Сусветнага банка па аперацыйных пытаннях спадаром Кайлам Пітэрсам.**

Супрацоўніцтва з Сусветным банкам вядзецца ў канструктыўным ключы. Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, мы змаглі знайсці агульную мову:

— Вельмі добра, што мы з вамі супрацоўнічаем, і, відаць, вы не маеце да нас вялікіх прэтэнзій. Мы рэалізавалі з вамі амбіцыйную праграму і сёння распрацоўваем новы план, новую стратэгію нашага супрацоўніцтва. Гэта кажа пра тое, што мы знайшлі агульную мову. Але галоўнае заключаецца ў тым, што вы сваімі дзеяннямі ў Беларусі даяце нам альтэрнатыву. Ваша праца ў Беларусі дае нам магчымасць абапірацца не толькі на адну-дзве крыніцы падтрымкі нашай эканомікі, сацыяльных праектаў, бюджэту і гэтак далей, але і на вельмі магутную падтрымку Сусветнага банка. Вось за гэта я вам, перш за ўсё, удзячны.

Прэзідэнт слушна заўважыў: калі няма альтэрнатывы, калі перад табой няма выбару, тады вельмі складана будаваць эканамічныя адносіны ўнутры і выбудоўваць сацыяльную палітыку.

— Калі ёсць выбар, калі ёсць альтэрнатыва, тады больш магчымасцяў прыйсці да поспеху, — упэўнены беларускі лідар. — За час нашага супрацоўніцтва вы інвеставалі ў краіну мільярд шэсцьсот мільёнаў долараў, і зараз у нас праграма амаль на мільярд долараў. Хачу запэўніць у тым, што, калі мы вам нешта паабяцалі, вы можаце не турбавацца — мы свае абяцанні цвёрда выконвалі і будзем выконваць у будучыні.

Кайл Пітэрс падзякаваў Прэзідэнту за цёплы прыём і магчымасць на свае вочы ўбачыць, як рэалізуюцца ў нашай краіне сумесныя з Сусветным банкам праграмы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

# Нікога не пакінулі без увагі



**У мінулую суботу ў Горацкім райвыканкаме яго старшыня Уладзімір ПІСКІЖАЎ правёў прамую тэлефонную лінію. Ён гэта робіць ужо трэці тыдзень запар для таго, каб максімальна шмат пачуць пра праблемы грамадзян.**

Пытанні да кіраўніка раёна ў гэты выхадны паступілі досыць разнапланавыя. Некаторыя з іх носяць сезонны характар. Яны звязаны з дарогамі, асабліва ў сельскай мясцовасці. Гэта штогадовая праблема, да вырашэння якой у выканкаме гатовыя. У мінулыя два гады праблемныя ўчасткі выяўлялі і самастойна, і па зваротах грамадзян, праводзілі падсыпку пясчана-гравійнай сумессю. Цяпер работа ідзе ў планавым парадку. Пакуль што чакаюць, каб грунтовыя воды сталі крыху ніжэйшымі. Але да восені ўсе ўчасткі плануецца давесці да ладу.

Былі і пытанні кансультацыйныя. Напрыклад, тэлефанавала маладая маці, якая цікавілася магчымасцю атрымаць жылое памяшканне — камерцыйнае ці арэнднае. Горацкі раён якраз стаў адным з першых сельскіх рэгіёнаў у Магілёўскай вобласці, які заняўся будаўніцтвам арэнднага жылля. Такім чынам была складзена канкурэнцыя на другасным рынку. Адна з асаблівасцяў раёна заключаецца ў тым, што тут працуе Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія. Яе студэнты досыць высока паднялі ўзровень цэн жылых памяшканняў, здымных кватэр. «Таму мы будаўніцтвам арэнднага жылля планку гэтую панізілі», — гаворыць старшыня. Жанчыне растлумачылі, якім чынам можна падаць дакументы, каб стаць на чаргу.

Таксама было пытанне ад чалавека, нераўнадушнага да сітуацыі з ацяпленнем. «Паступіў сігнал, што ў адной з кватэр гарачавата. Людзі пачынаюць лічыць свае грошы — і правільна робяць, бо дапамагаюць нам выяўляць марнатраўства службаў, якое, магчыма, мяжуе з безгаспадарнасцю», — расказвае Уладзімір Піскіжаў. На сігнал аператыўна адрэагавалі. На месца выехала санстанцыя з замерамі тэмпературнага рэжыму, пасля быў праведзены аналіз, наколькі тэмпература адпавядае графіку цеплыні ў памяшканні і за акном. За парушэнне службовыя асобы жыллёва-камунальнай гаспадаркі панясуць адказнасць.

У хуткім часе Радаўніца, людзі накіруюцца на магілкі сваякоў. Таму адно з пытанняў датычылася магчымасці падвесці да могілак ваду, каб памыць помнікі пасля зімы, пасадзіць кветкі. «У хуткім часе гэтае пытанне вырашыцца. На два тыдні да Вялікадня і два тыдні пасля Радаўніцы ўмовы будуць створаны, каб людзі маглі прыехаць і нармальна прыбраць магілкі памерлых сваякоў», — пракаментаваў зварот старшыня выканкама.

Ужо бліжэй да канца прамой лініі да Уладзіміра Уладзіміравіча звярнулася жанчына па пытанні працаўладкавання. Па прафесіі яна аграном, працавала ў Расіі, зараз месца працы не мае і хоча, каб яе вызвалілі ад неабходнасці выплаты збору на фінансаванне дзяржвыдаткаў. Старшыня прапанаваў ёй сабраць неабходныя дакументы і падаць іх у «адно акно». Але заяўніца сказала, што ёй важна менавіта паразмаўляць з ім. На што Уладзімір Піскіжаў прапанаваў прыйсці ёй да яго на прыём у любы зручны час. «Увогуле, я заўжды, калі не на выездзе, прымаю людзей. Ёсць правіла, што трэба загадзя запісвацца на прыём. Але калі чалавек прыехаў здалёк, не адпраўляць жа яго дадому ні з чым?» — кажа ён.

З тымі, у каго ўзнікаюць такога кшталту пытанні, як апошняе, штодзённа працуюць тры групы, створаныя з ліку спецыялістаў выканкама. Яны прымаюць грамадзян і даюць кансультацыю. Такія камісіі прынялі 95 жыхароў Горацкага раёна, з іх 60 вызвалены ад выплаты. За час работы камісій (пачынаючы з лютага) працаўладкаваліся 132 чалавекі.

На жаль, дагэтуль не ўсе ведаюць, што ад выплаты збору іх могуць вызваліць. Таму ў выканкаме тэлефануюць кожнаму і запрашаюць на асабістыя прыём. «За мінулы тыдзень мы прынялі 605 чалавек, засталося 592. Аб'ём каласальны, але затое ў нас сумленне чыстае перад людзьмі, што мы нікога не пакінулі без увагі», — кажа Уладзімір Піскіжаў.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Тэрэза Мэй запусціла працэдуру выхаду Вялікабрытаніі з ЕС



Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй падпісала паведамленне ўладам Еўрасаюза аб фармальным запуску працэдуры выхаду краіны з ЕС. Пра гэта паведамляе Reuters.

Апавяшчэнне было ўручана кіраўніку Еўрасавета Дональду Туску асабіста пастаянным прадстаўніком Злучанага Каралеўства Цімам Бароу ў сераду, 29 сакавіка.

Яшчэ 16 сакавіка каралева Вялікабрытаніі Лізавета II ухваліла закон аб запуску Брэксіту. Раней парламент Вялікабрытаніі надзяліў прэм'ер-міністра краіны Тэрэзу Мэй паўнамоцтвамі аб запуску працэдуры па выхадзе краіны са складу Еўрапейскага саюза, прыняўшы адпаведны законапраект.

Нагадаем, 23 чэрвеня 2016 года ў Вялікабрытаніі адбыўся рэферэндум, па выніках якога грамадзяне краіны большасцю галасоў прынялі рашэнне аб выхадзе з Еўрасаюза. Канкрэтныя ўмовы выхаду не вызначаны, яны будуць устаноўлены на перагаворах паміж Лонданам і краінамі ЕС, якія пачнуцца пасля афіцыйнай заявы аб выхадзе з Еўрасаюза і працягнуцца не больш за два гады.

### Прэзідэнт Малдовы ініцыяваў рэферэндум аб пашырэнні сваіх паўнамоцтваў

Прычына, па якой прэзідэнт Ігар Дадон ініцыяваў кансультацыйны рэферэндум, — канфлікт з праеўрапейскай большасцю ў парламенце. Адпаведны ўказ ён падпісаў проста на прэс-канферэнцыі, прысвечанай ста дням прэзідэнцкага тэрміну.

Паводле яго слоў, на плебісцыт будуць вынесены чатыры пытанні: аб наданні прэзідэнту дадатковых правоў для роспуску парламента і арганізацыі датэрміновых выбараў, зніжэнні колькасці дэпутатаў парламента са 101 да 71, адмене прынятага парламентам закона, які ўскладу на насельніцтва цяжар вяртання ўкрадзенага з банкаўскай сістэмы €1 млрд, а таксама пытанне аб вывучэнні ў школах гісторыі Малдовы замест гісторыі Румыніі.

### Ілан Маск падтрымаў стварэнне фірмы па распрацоўцы метаду запісу думак на камп'ютар

Амерыканскі прадпрымальнік Ілан Маск паспрыяў стварэнню ў ЗША новай кампаніі, якая будзе займацца распрацоўкай метаду запісу думак чалавека на лічбавыя носьбіты. Пра гэта гаворыцца ў артыкуле, апублікаваным газетай The Wall Street Journal.

Галоўным напрамкам работы кампаніі, як чакаецца, стане распрацоўка тэхналогій, якія дазваляюць счытваць дадзеныя з мозга чалавека і запісваць іх на лічбавыя носьбіты, а таксама ажыццяўляць зваротную аперацыю. Заснавальнік кампаніі Neuralink разлічвае, што ў перспектыве гэтыя метады дазволяць павялічыць магчымасці чалавечага інтэлекту, а таксама лячыць некаторыя захворванні, у тым ліку эпілепсію ці параліч. Язк адзначае выданне, Neuralink ужо пачала набіраць штат навуковых супрацоўнікаў. У іх ліку спецыялісты ў сферы электронікі, а таксама даследчыкі, якія займаюцца вывучэннем мозга.

Паводле апошніх ацэнак часопіса Forbes, багацце Маска перавышае $13,8 млрд. Яго асноўныя інвестыцыі звязаны з альтэрнатыўнай электраэнергетыкай і развіццём камерцыйных касмічных праграм.

## СУБОТНІ ІНТЭРАКТЫЎ

**Ва ўсіх рэгіёнах краіны працягваюць работу прамыя тэлефонныя лініі**

**Разбірацца ў камунальных, жыллёвых, дарожных і іншых набалелых пытаннях 1 красавіка будуць прадстаўнікі абласных, гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, а таксама кіраўнікі спраў. Патэлефанаваць чыноўнікам можна з 9 да 12 гадзін. Нагадаем, «гарачыя» лініі працуюць кожную суботу.**

**Брэсцкі аблвыканкам:** намеснік старшыні СЯРКОЎ Міхаіл Мікалаевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам:** кіраўнік спраў СЫСОЕЎ Аляксандр Уладзіміравіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам:** першы намеснік старшыні МІКАЛУЦКІ Аляксандр Віктаравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам:** намеснік старшыні ЛІСКОВІЧ Віктар Андрэевіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам:** намеснік старшыні КУНЦЭВІЧ Андрэй Міхайлавіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам:** першы намеснік старшыні МАКАР Ігар Мікалаевіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам:** намеснік старшыні КРЭПАК Аляксандр Пятровіч (80172224444).

■ Пашана і прызнанне

# ШТО НІ ЛАЎРЭАТ, ТО ТВОРЦА

**Ганаровага звання «Чалавек года Міншчыны» за 2016-ы ўдастоены 22 прадстаўнікі вобласці ў розных намінацыях. Цырымонія ўзнагароджання адбылася ў Доме культуры Клецка. Уладальнікам ганаровага звання ўручаны спецыяльныя дыпломы і стужкі. Яны атрымаюць таксама грашовыя выплаты ў памеры 100 базавых велічынь (2300 рублёў).**

— У кожным відзе спорту, як правіла, заўсёды ёсць лідар. Так і ў любой прафесіі. Сёння выбар выпаў менавіта на вас. Але людзей, якія самааддана працуюць на дабрабыт Радзімы, значна больш, — звярнуўся да прысутных **старшыня Мінаблвыканкама Сямён ШАПІРА.** — У выніку намаганняў працаўнікоў Міншчына на працягу апошніх 5—6 гадоў наперадзе іншых абласцей краіны. Наш рэгіён быў першы і ў цяжкім 2016-м, калі ўпала вытворчасць, скараціліся рынкі збыту. За два месяцы сёлета Мінская вобласць дала прырост валавой вытворчасці на 106% да аналагічнага леташняга перыяду. І гэта вынік добрасумленнай працы ўсіх, а таксама добрай сістэмы кіравання, якая створана не толькі на Міншчыне, але і ў цэлым у нашай краіне.

Сярод узнагароджаных людзі розных прафесій: урачы, педагогі, работнікі пракуратуры, бізнесоўцы, ратавальнікі, лесаводы, жывёлаводы, вадзіцелі. У іх ліку і наша калега — рэдактар абласной газеты «Мінская праўда» Вольга Шпілеўская.

На думку Вольгі Аляксандраўны, для сябе асабіста яна «перайначыла» б гэтае высокае званне ў «Калектыў года Міншчыны», паколькі ў рэдакцыі моцная каманда, дзе кожны супрацоўнік на сваім месцы і ўсе разам яны дабіліся таго, што маюць.

Важкі ўклад у харчовую бяспеку краіны ўнесла Таццяна Анейчык — аператар машыннага даення малочнатаварнай фермы «Калодзіна» сельгасфіліяла закрытага акцыянернага таварыства «Вітэкс» Уздзенскага раёна. Таццяна Віктараўна надаіла за мінулы год 10300 кілаграмаў малака ад кожнай каровы.

Станіслаў Луцэвіч са Стаўбцоўскага раёна ўжо сорак гадоў за рулём аўтамабіля. Цяпер ён вадзіцель і па сумяшчальніцтве прадавец аўтакрамы. Станіслаў Іванавіч абслугоўвае 14 населеных пунктаў. Прывозіць не толькі прадукты харчавання першай неабходнасці, але і выконвае індывідуальныя заказы: дастаўляе лекі з райцэнтра. Зімой ён пад'язджае да падворка кожнага старога, а калі замецена дарога, то і заносіць прадукты ў хаты.

Словам, што ні чалавек, то прафесіянал і нават мастак, які ўносіць у, здавалася б, звычайную працу свае ноу-хау, творчасць і іскрынку задору.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

# Годныя людзі

## У Жодзіне вызначылі найлепшых спецыялістаў

**Падзяку за сваю працу атрымалі людзі з розных сфер дзейнасці: ад пекара да прадпрымальніка, ад настаўніка музыкі да муляра. На ўрачыстым мерапрыемстве былі падведзены вынікі работы народнай гаспадаркі горада Жодзіна за 2016 год. Найлепшыя арганізацыі, працаўнікі трапілі на Дошку гонару.**

Для вызначэння найлепшых прафесіяналаў было зацверджана некалькі намінацый: узнагароджваліся прадстаўнікі будаўнічага комплексу, прамысловасці, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, працаўнікі аховы здароўя, адукацыі, культуры, сацыяльнай дапамогі, органаў правапарадку, навукі, фізічнай культуры і спорту... На сцэну падчас святочнага мерапрыемства падымаліся не толькі заслужаныя работнікі, што шмат гадоў працуюць у сваёй галіне. Урач стаматолаг-артапед Канстанцін Кароўкін працуе ў стаматалагічнай паліклініцы Жодзінскай цэнтральнай гарадской бальніцы крыху больш за год, аднак ужо заслужыў права мець ганаровае званне «Найлепшы малады спецыяліст».

Не засталіся па-за ўвагай і працоўныя дынастыі жодзінцаў. Сем'і, што пакаленнямі застаюцца ў прафесіі, для кожнага прадпрыемства — амаль што легенда, а для горада — важная частка гісторыі. Сёлета былі адзначаны тры такія дынастыі: сям'я Тарасевіч — Гаруновіч, якая працуе на ААТ «Світанак» 94 гады, жанчыны з дынастыі Сінкевіч — Серафімовіч — Бруй 120 гадоў перадаюць у спадчыну прафесію педагога, а агульны стаж працы сям'і Гірдзёнак на Беларускім аўтамабільным заводзе складае 175 гадоў. За бацькамі ў свой час туды на працу пайшлі дачка, сын, нявестка і ўнук з унучкай.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

■

■ Абітурыент-2017

# ЗДЗЕЙСНІЦЬ «РАЗВЕДКУ»

**...запрашаюць сталічныя ВНУ, дзе ў наступную суботу, 1 красавіка, пройдуць Дні адкрытых дзвярэй.**

**Маштабным Фестывалем факультэтаў будзе сустракаць гасцей Белдзяржуніверсітэт.** Дэвіз свята, якое дае старт прыёмнай кампаніі — 2017, — «Я выбіраю БДУ». Месца правядзення ўсіх мерапрыемстваў — Ліцэй БДУ (вул. Ульянаўская, 8). Пачатак у 10.00. Урачыстае адкрыццё з удзелам рэктара акадэміка Сяргея Абламейкі запланавана на 11.00.

У зоне візуальнага стэнда «Абітурыент-2017» спецыялісты прыёмнай камісіі адкажуць на ўсе пытанні, якія цікавяць выпускнікоў. Акрамя «інфармацыйных» пляцовак тут будзе працаваць выстаўка навуковых распрацовак БДУ, пройдуць прэзентацыі спартыўнага жыцця студэнтаў БДУ і псіхалагічнай службы ўніверсітэта.

Навінкай фестывалю стане шэраг універсітэцкіх ініцыятыў. Упершыню адбудзецца афіцыйная прэзентацыя праектаў «Фэст інтэлектуальных гульняў школьнікаў» і «Студэнт на тыдзень», якія праводзіліся ў ВНУ цягам года. Таксама ўпершыню на фестывалі будзе працаваць пляцоўка «Твая паспяховая кар'ера пачынаецца ў БДУ», дзе абітурыенты даведаюцца аб карпарацыях, арганізацыях і кампаніях, у якіх працуюць выпускнікі БДУ.

**Не менш грандыёзнае свята абяцаюць арганізаваць і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі (БДУІР).** Старт — у 10.30 у вучэбным корпусе №2 па вуліцы Петруся Броўкі, 4. У фае разгорнецца інтэрактыўная кансультацыйная пляцоўка прыёмнай камісіі. Тут жа можна будзе зарэгістраваць свой асабісты электронны кабінет і навучыцца ім карыстацца. А аб 11-й гадзіне ў актавай зале з абітурыентамі сустрэнецца кіраўніцтва ўніверсітэта, адказны сакратар прыёмнай камісіі і выпускнікі БДУІР. Таксама перад будучымі студэнтамі галоўнага ІТ-універсітэта выступіць намеснік дырэктара адміністрацыі ПВТ Аляксандр Марцінкевіч. А ў 13.15 распачнуцца сустрэчы абітурыентаў з дэканамі факультэтаў.

На Дні адкрытых дзвярэй таксама будзе дадзены старт праекту «#Я ў БДУІР: стань студэнтам на адзін дзень». Па ўмовах праекта стаць яго ўдзельнікамі змогуць толькі тыя, хто быў на Дні адкрытых дзвярэй 1 красавіка і зрабіў на мерапрыемстве фота на памяць.

**На Дзень адкрытых дзвярэй запрашаюць 1 красавіка таксама БДЭУ і БДПУ.** Мерапрыемствы на факультэтах эканамічнага ўніверсітэта пройдуць па наступным графіку:

Улікова-эканамічны факультэт і факультэт права — 11.00, актавая зала навучальнага корпуса №5 (вул. Свярдлова, 7).

Факультэт камерцыі і турыстычнай індустрыі, факультэт міжнародных бізнес-камунікацый, інстытут сацыяльна-гуманітарнай адукацыі — 12.30, актавая зала навучальнага корпуса №5 (вул. Свярдлова, 7).

Факультэт фінансаў і банкаўскай справы, факультэт маркетынгу і лагістыкі — 11.00, актавая зала навучальнага корпуса №2 (пр-т Партызанскі, 26).

Факультэт менеджменту і факультэт міжнародных эканамічных адносін — 12.30, актавая зала навучальнага корпуса №2 (пр-т Партызанскі, 26).

У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце (вул. Савецкая, 18) мерапрыемства стартуе аб 11-й гадзіне ў актавай зале. Абітурыентам і іх бацькам будзе прадастаўлена магчымасць сустрэцца з кіраўніцтвам універсітэта, выкладчыкамі, студэнтамі, а таксама з вядомымі выпускнікамі гэтай навучальнай установы.

Госці вядучай педагагічнай ВНУ змогуць азнаёміцца з мультысэрвісным інфармацыйным адукацыйным асяроддзем універсітэта, сучаснымі інтэрактыўнымі класамі, рэпазіторыем, электроннай бібліятэкай, залай рэдкай кнігі, планетарыем і спартыўным комплексам...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# Гурткі для танцораў і гумарыстаў

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Нешматлікія прадстаўнікі дужага полу, якія прыходзяць у цэнтр, запісваюцца толькі на камп'ютарныя курсы. Або наведваюць гумарыстычны клуб: на яго сходах, што адбываюцца раз на месяц, спяваюць прыпеўкі, рыхтуюцца да канцэртаў самадзейнасці. З красавіка плануюць адкрыць танцы — вось дзе чакаюць наплыву мужчын! Кажуць, пенсіянеры з вёскі ўжо тэлефанавалі, распытвалі.

— А так канкрэтна для мужчын гурткоў няма. Не было прапаноў. Разумеецца, ці пачнуць працаваць новыя гурткі, залежыць ад попыту. Калі ёсць пэўныя пажаданні з боку пенсіянераў і збіраецца некалькі чалавек, тады адкрываем новы кірунак, — тлумачыць **загадчыца аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту ТЦСАНа Святлана ФІЛІНОВІЧ.**

Калі ў Лунінцы танцы для сталых людзей толькі збіраюцца адкрываць, то ў тэрытарыяльным цэнтры Партызанскага раёна сталіцы танцавальны калектыў ужо існуе. І мужчыны ва ўзросце ў яго складзе ёсць.

— Як ні дзіўна, ім гэта цікава, — кажа **дырэктар цэнтра Алена КАНАПЛЁВА**. — А вось на лячэбную фізкультуру не ходзяць.

Затое клапоцяцца аб духоўным: сталічныя пенсіянеры-мужчыны наведваюць гуртк псіхалогіі, захапляюцца віртуальным турызмам і збіраюцца ў клубе «Літаратурная гасцёўня». Праўда, большасць удзельнікаў гурткова-клубнай дзейнасці, чакана, усё роўна складаюць жанчыны: з 78 чалавек іх — 72. «У жанчын, мне здаецца, больш сацыяльна актыўная пазіцыя», — спрабуе знайсці гэтаму тлумачэнне, апроч дэмаграфічнага, Алена Канаплёва.

### ДЛЯ СТАЛЯРНАЙ МАЙСТЭРНІ НЯМА БАЗЫ

Тое, што аддзяленні дзённага знаходжання для пажылых вельмі актуальныя і запатрабаваныя, адзначаюць у Валожынскім раёне.

— Калі пачыналі гэту дзейнасць, сумняваліся, не ведалі, будзе карыстацца папытам ці не. А цяпер кожны месяц хто-небудзь новы прыходзіць, — хваліцца **загадчыца аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту мясцовага ТЦСАНа Ірына КАВЯЗА.**

Для жыхароў раёна адкрыты жаночыя клубы «Лэдзі» і «Залатая восень», гуртк па сацыяльным турызме (там арганізуюць экскурсіі, фінансава даступныя для пенсіянераў), фітнес. А куды ж ходзяць мужчыны? Як нам расказалі, тыя, хто маладзейшы, запісваюцца на камп'ютарныя курсы (палова групы — прадстаўнікі дужага полу), больш сталыя — на лячэбную фізкультуру (вельмі запатрабаваны кірунак). Аднаму з наведнікаў аддзялення — ужо за 80.

— А што да асобных мужчынскіх гурткоў... Каб тую ж сталярную майстэрню адкрыць, у нас базы няма. Не хапае памяшканняў, — прызнаецца Ірына Кавяза.

Аддзяленне для пажылых пры тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання Іванаўскага раёна наведвае 46 пенсіянераў. Мужчын з іх ліку — толькі тры. Яны ўдзельнічаюць у якасці валанцёраў у праекце па навучанні пенсіянераў эканамічнай грамаце, ездзяць у экскурсіі.

— А гурткі ў нас у асноўным звязаны з рукадзеллем і кулінарыяй, — апісвае карціну **дырэктар цэнтра Наталля КАСЦЮКОВІЧ**. — Спрабавалі ўвесці што-небудзь «мужчынскае», але ў тых наведнікаў аддзялення, якія цяпер да нас ходзяць, розныя інтарэсы. А прыцягнуць іншых мужчын ва ўзросце пакуль не змаглі.

Чаму жанчыны аказваюцца больш актыўнымі? На думку Наталлі Касцюкевіч, на гэта ёсць і аб'ектыўныя прычыны. Прадстаўніцы прыгожага полу жывуць даўжэй (іх сярэдняя працягласць жыцця — 78 гадоў, у той час калі ў мужчын — 66), а таму яны больш поўныя сіл і здароўя, чым іх аднагодкі-мужчыны. Дый у апошніх хапае спраў і акрамя гурткоў.

— Напрыклад, у нашым гарадку вялікі прыватны сектар. Мужчына заўсёды знойдзе сабе работу на падворку, будзе майстраваць у гаражы.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

**Даведка**

**Усяго на пачатак года ў Беларусі пры тэрытарыяльных цэнтрах было створана 132 аддзяленні дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту (амаль у чатыры разы больш, чым, напрыклад, у 2014-м). Колькасць пенсіянераў, якія наведваюць аддзяленні на пастаяннай аснове, — 8,3 тысячы чалавек.**

ФАКТЫ НАВІНЫ ПАДЗЕІ

## ВІЛЕЙШЧЫНА ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ

**У Вілейскім раёне з'явіўся свой птушыны сімвал — белы бусел. Папярэдне на сайце раённай газеты «Шлях перамогі» было аб'яўлена галасаванне, у якім прыняло ўдзел каля 500 чалавек.**

Акрамя таго, па гэтым пытанні можна было выказацца па тэлефоне або накіраваць прапановы паштоўкай з абгрунтаваннямі за таго або іншага прэтэндэнта. У выніку аднолькавую колькасць галасоў атрымалі бусел і кнігаўка — па 170. Аднак з улікам тэлефоннага і паштовага галасавання свайго канкурэнта апярэдзіў бусел. На сімвал горада таксама прэтэндавалі белая чапля, арлан-белахвост, дзяцел. Аднак яны адсталі ад сваіх «калег».

Вынікі галасавання зацверджаны на сесіі раённага Савета дэпутатаў.

Як мне здаецца, большасць віляйчан спынілася менавіта на гэтай птушцы як сімвале раёна невыпадкова. Уязны знак у Вілейку вянчае буслінае гняздо наверсе. Буслянку ўладкаваў былы вадзіцель, а цяпер пенсіянер Сяргей Казлоўскі. «Кватэра» спадабалася новым жыхарам, і яны пасяляюцца тут кожную вясну. Ну, а віляйчане назіраюць за палётам гэтых прыгожых птахаў і радуюцца: дзе жыве бусел — там будзе шчасце і дабрабыт.

Сімвал раёна, дарэчы, можна будзе выкарыстоўваць у турыстычных мэтах: вырабляць сувеніры, паштоўкі, устанаўліваць малыя архітэктурныя формы і кампазіцыі, прыцягваць гасцей нейкімі легендамі, казкамі пра буслоў, звязанымі з тутэйшымі мясцінамі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

## ДРАНКА ЗАМЕСТ ГАЗУ

**У аграгарадку Зябраўка Гомельскага раёна і ў пасёлку Зарэчча Рэчыцкага раёна ўведзены дзве кацельні, якія выкарыстоўваюць мясцовыя віды паліва. Сёння яны замяшчаюць каля 2 млн куб. м прыроднага газу. Важныя аб'екты пабудаваны пры падтрымцы Сусветнага банка. Іх кошт складае больш за $5,2 млн.**

У прэс-службе Гомельскага аблвыканкама расказалі, што раней цеплазабеспячэнне жылых дамоў у Зябраўцы ажыццяўлялася за кошт дзвюх кацельняў, якія цалкам выпрацавалі свой рэсурс. Новая магутнасцю 8 МВт працуе за кошт спальвання дранкі, пры гэтым гадавы эканамічны эфект ад рэалізацыі гэтага інвестпраекта па плане павінны скласці Br489 тысяч, а прагназуемая эканомія — восемсот тысяч кубаметраў газу ў год.

Пры распрацоўцы генеральнага плана тэрыторыі новай кацельні ўлічана блізкае размяшчэнне жылых дамоў і праведзены неабходныя мерапрыемствы: зроблена шумазасцярога і асобны ўезд на тэрыторыю па новай дарозе, якая абыходзіць жылую забудову.

Новая кацельня ў Зарэччы каштавала $2 млн 841 тыс. У ёй усталяваны тры катлы агульнай магутнасцю 6,3 МВт і адзін рэзервовы на прыродным газе магутнасцю 5,2 Мвт. Плануецца, што гадавы эканамічны эфект складзе Br581 тысячу.

Камунальнікі абяцаюць, што работа ў гэтым кірунку будзе працягнута. Задача на самую блізкую перспектыву — максімальна атрымліваць цеплавую энергію за кошт уласных узнаўляльных прыродных рэсурсаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

## НА 1,4 ПРАЦЭНТА БОЛЬШ

**У бюджэтных арганізацыях краіны намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата ў студзені—лютым 2017 года склала Br565, у лютым — Br569,4, што на Br7,9, або на 1,4 працэнта больш, чым у студзені 2017 года. Такія звесткі апублікаваны на сайце Нацыянальнага статыстычнага камітэта.**



Рэальная заработная плата ў бюджэтных арганізацыях у студзені-лютым бягучага года ў параўнанні з адпаведным перыядам 2016-га зменшылася на 1,7 працэнта, у лютым у параўнанні са студзенем 2017 года яна павялічылася на 0,9 працэнта.

Паводле інфармацыі Белстата, намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў арганізацый краіны (без мікраарганізацый і малых арганізацый без ведамаснай падпарадкаванасці) у студзені—лютым 2017 года склала Br717,8, у тым ліку ў лютым — Br716,5, што на Br4,2 або на 0,6 працэнта менш, чым у студзені 2017 года.

## ЭКАНОМІЎ НА ПАДАТКАХ

**За тры гады дырэктар бабруйскай кавярні «Дзікі мёд» завінаваціўся дзяржаве больш чым 80 тысяч рублёў.**

Таемнае стала яўным падчас праверкі фінансавай дзейнасці прадпрыемства. «На працягу 2012—2015 гадоў дырэктар даваў указанні работнікам бухгалтэрыі заніжаць выручку, атрыманую ад паслуг кафэ «Дзікі мёд», і завышаць кошт панесеных выдаткаў, — удакладніў **намеснік начальніка ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Рэспублікі Беларусь па Магілёўскай вобласці Аляксандр ШАРОЙКІН.** — У сувязі з гэтым у дэкларацыях па падатках на дабаўленую вартасць і прыбытках, якія падаваліся ў тэрытарыяльную падатковую інспекцыю, заніжаліся сумы падаткаў».

Кіраўнік сваю віну ўразумеў і ўжо цалкам кампенсаваў доўг. Але адказваць усё роўна прыйшлося. Суд Бабруйскага раёна прызначыў яму пакаранне ў выглядзе 1 года і 6 месяцаў абмежавання волі без накіравання ў выпраўленчую ўстанову адкрытага тыпу і без канфіскацыі маёмасці. А таксама пазбавіў права займаць пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых і адміністрацыйна-гаспадарчых абавязкаў тэрмінам на 5 гадоў (частка 2 артыкула 243 КК Рэспублікі Беларусь).

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# «МУЗЕЙ» У ПАЛАЦЫ

**Учора ў Палацы Незалежнасці адбылася новая, прыемна чаканая для яго падзея: у сценах, якія звычайна прымаюць высокапастаўленых асоб з усяго свету, адкрылася персанальная выстаўка айчыннага мастака. Вядомы беларускі пейзажыст Валерый Шкаруба прадставіў калегам пятнаццаць сваіх работ, якія арганічна ўпісаліся ў інтэр'ер будынка.**

«Калі пазванілі і сказалі, што ёсць прапанова зладзіць выстаўку ў Палацы Незалежнасці, я нават не зразумеў адрасу, дзе гэта, але дакладна пачуў: «Незалежнасці», — дзеліцца ўражаннямі **заслужаны дзеяч мастацтваў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Валерый ШКАРУБА**. — Для мяне гэта ключавое слова. Што можа быць лепшым? Таму быў дужа рады, калі ўцяміў, дзе збіраюцца арганізаваць выстаўку». На думку мастака, пейзаж быў, ёсць і будзе — у адрозненне ад будынкаў і людзей. Менавіта таму мастак зрабіў гэты жанр ключавым у сваёй творчасці. Астатнія работы Валерыя Шкарубы знаходзяцца ў Барысаве, у персанальнай карціннай галерэі, адкрытай для наведвальнікаў.

На думку **старшыні Беларускага саюза мастакоў Рыгора СІТНІЦЫ**, Валерый Шкаруба — гэта мастак, які стварыў сябе сам. Сам прыдумаў аўтарскі краявід, які пазнаецца здалёк і не патрабуе подпісу. Краявід вельмі адметны, які шмат у чым зламаў стэрэатыпы традыцыйных пейзажыстаў. «У яго пісьмо не зусім жывапіснае. Але гэта ні ў якім разе не мінус, а яго ўнікальная адметнасць. Інакш мастак мог бы згінуць як творца сярод яму падобных», — дзеліцца ўражаннямі Рыгор Сямёнавіч.

**Уладзімір ПРАКАПЦОЎ, генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі**, прапаноўвае скласці графік ці план выставак у Палацы, чаргаваць масцітых творцаў і пачынаючых талентаў. «Тут можа быць не толькі жывапіс, але і батык, і габелены, і скульптуры, і кераміка. Зала гэта дазваляе зрабіць. Гэта, па сутнасці, атрымліваецца музей у Палацы», — падсумоўвае ён.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

# ВЯЛІКІ ШОЎКАВЫ ШЛЯХ: КНІЖНАЕ ПРАЧЫТАННЕ

**6 красавіка ў Алматы (Казахстан) пачынае сваю работу IX Міжнародная кніжная і паліграфічная выстаўка «Па Вялікім Шоўкавым шляху». Удзел у ёй прымаюць і прадстаўнікі Беларусі кніжнай.**

У праграме выстаўкі — сустрэча з вядомым паэтам Мухтарам Шаханавым. У першы дзень будзе прэзентаваны стэнд Рэспублікі Беларусь «500-годдзе беларускага кнігадрукавання». Расійская Федэрацыя па традыцыі пазнаёміць з Выдавецкай праграмай урада Масквы. Расійскі крытык, літаратуразнаўца Наталля Іванова прадставіць сваю кнігу «Такое літаратурнае жыццё». Са сваімі новымі творамі гасцей выстаўкі пазнаёміць славуты казахскі паэт Алжас Сулейменаў, якога добра ведаюць і ў Беларусі. У перакладзе Міколы Мятліцкага яго вершы друкаваліся ў часопісе «Полымя». Алжас Сулейменаў параўнальна нядаўна правёў свой творчы вечар у Доме літаратара ў Мінску.

Асобны рэй па традыцыі на выстаўцы будуць весці літаратуразнаўцы. Казахскія сябры, несумненна, успомняць і беларускі інтэрнэт-партал «Сугучча: літаратура і публіцыстка краін Садружнасці». На гэтым рэсурсе, заснаваным Выдавецкім домам «Звязда», ёсць адмысловыя старонкі «Літаратурны Казахстан», «Свет Мухтара Ауэзава», «Немат Келімбетаў» (між іншым, «Звязда» ў перакладзе на беларускую мову выдала тры кнігі Немата Келімбетава — «Не хачу губляць надзею», «Лісты да сына», «Зайздрасць»), «Абай крочыць па планеце».

Шмат увагі на выстаўцы ўдзелена вучэбнай, адукацыйнай літаратуры. Відавочна, гэта падказка і для беларускага боку — з чым ехаць у розныя краіны, што перш-наперш прэзентаваць у кніжным свеце.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# КРЭВА. КРАЕВУГОЛЬНЫЯ КАМЯНІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Такім чынам, тэхніка выкарыстоўвалася ў межах распрацоўкі праекта аднаўлення замка. Бо ў месцах, дзе патрэбна было правесці інжынерна-геалагічныя даследаванні, аказалася шмат цяжкіх камянёў і друзу, якія перашкаджалі рабіць пошукі. Таму і вырашана было падключыць да падрыхтоўчых работ тэхніку.



З аднаго боку, усё ў парадку — на замку пачаліся работы ў межах падрыхтоўкі праекта рэстаўрацыі. Але, з іншага, ці нельга было выкарыстаць больш ашчадныя метады?.. Каб атрымаць экспертную ацэнку дзеянняў на замку, мы звярнуліся да **намесніка дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вадзіма ЛАКІЗЫ**. Ён расказаў, што работы на аб'екце праводзіліся без абавязковага ў такіх выпадках археалагічнага нагляду Інстытута гісторыі. Таму іх установай ужо накіраваны лісты з выкладзенай праблемай у Белрэстаўрацыю, а таксама яго копіі ў Міністэрства культуры Беларусі і Гродзенскі аблвыканкам.

— Крэва даследуе наш супрацоўнік Алег Дзярновіч. Але да яго па кансультацыю ніхто не звяртаўся, — тлумачыць Вадзім Лакіза. — Такія работы можна было правесці без бульдозера. А ў выпадку выкарыстання тэхнікі не такім варварскім чынам. Калі мы кажам пра рэстаўрацыю, то гэтыя камяні не варта проста ссоўваць убок — іх можна выкарыстаць пры аднаўленні замка.

Відавочна, у гэтай сітуацыі ўсё не так адназначна. Праблема значна глыбейшая, чым падаецца на першы погляд. У нас адсутнічае сістэма, тэхнічныя нарматыўныя дакументы, якія б тлумачылі, як менавіта павінны праходзіць работы на помніку гісторыка-культурнай спадчыны. Ці можа быць выкарыстаны бульдозер у месцы з гісторыяй у некалькі стагоддзяў? А калі можа, то на колькі сантыметраў ці метраў дазволена парушыць цэласнасць зямлі, каб захаваць культурны слой, у якім будуць працаваць археолагі?.. Пытанняў больш, чым адказаў. Відавочна, бракуе і спецыялістаў, якія дапамаглі б разабрацца і далі б кампетэнтныя парады... Нярэдка даводзіцца сутыкацца з сітуацыяй, калі на аб'ектах, унесеных у дзяржаўны спіс каштоўнасцяў, працуюць звычайныя будаўнікі. Вось таму і атрымліваем мы на выхадзе не зусім якаснае аднаўленне.

Аднак ёсць у гэтага медаля і іншы бок. Цікава, чаму наша грамадства ўскалыхваецца толькі тады, калі хтосьці пачынае нешта рабіць і, скажам, няправільна? Але і тое абурэнне не выходзіць за межы размоў на кухні і паведамленняў у сацыяльных сетках. Было дзіўна чытаць допісы ўдзельнікаў грамадскай арганізацыі, якія збіраліся ўстаць на абарону «раскапанага» Крэва, але пры гэтым не знайшлі часу, каб выехаць на месца і на свае вочы ўбачыць, што там адбываецца. «Калі раптам будзеце праязджаць міма замка, шчоўкніце фотаапаратам, дашліце нам пару здымкаў, а мы напішам ліст у якую-небудзь інстанцыю», — прыблізна так выглядаў іх пасыл. Можа быць, і гэта крок добры. Але ўсё-такі ён падаецца лянівым. Калі любіш нешта моцна, напрыклад замак, варта быць побач у цяжкі момант. Інакш такая любоў — толькі пыл і вецер.

Калі паставіць гэту манетку рабром, узнікае і яшчэ адна, трэцяя незразумелая сітуацыя. Ёсць у раёнах помнікі спадчыны, якім сапраўды патрэбна дапамога і догляд неабыякавых людзей. Старажытныя сядзібы, арыгінальныя бровары, нават прыўкрасныя палацы. Але яны так і стаяць занядбанымі, пакуль да іх нарэшце не дабярэцца дзяржава ці рэдкі энтузіяст, гатовы рызыкнуць і ўкласці ўласныя грошы. Супольнасць быццам не заўважае гэтага. Затое ўсенародны шквал абурэння выклікаюць выпадковыя, неправерaныя чуткі пра тое, што нешта робіцца, ды няправільна. Але не памыляецца толькі той, хто нічога не робіць.

Як прыклад адразу прыгадваецца Любчанскі замак і яго ваколіцы. Старажытны мур у мястэчку падымаецца з руін дзякуючы неабыякавым людзям — валанцёрам і мясцоваму жыхару Івану Пячынскаму, які вырашыў прысвяціць жыццё справе аднаўлення каштоўнасці малой радзімы. Аднак і гэты выпадак не застаўся незаўважаным — гучаць не толькі добрыя словы падтрымкі, але і крытыка, абурэнне: маўляў, не ўсе работы адпавядаюць нормам. Але асабіста ў мяне, калі кажуць нешта дрэннае пра аднаўленне гэтага замка, у памяці ўсплывае яшчэ адзін адметны мур, які стаіць за 10 кіламетраў ад Любчы, — пры дарозе, як едзеш праз Шчорсы ў Мінск. Гэта былая гаспадарчая пабудова палацавага комплексу славутага роду Храптовічаў. Узведзеная з чырвонай цэглы, у французскім стылі, вянчае яе зграбная вежачка. Аднак з кожным годам гэта архітэктурная цікавінка разбураецца больш і больш, з усіх бакоў шчыльна зарастае хмызняком... Бо няма дбайнага гаспадара, які б узяў адказнасць за яе захаванне. Кажуць, яшчэ пару дзесяткаў гадоў таму вежачку вянчаў адметны флігель, а па руках у мясцовых жыхароў хадзіла шмат старажытных каштоўных кніг з багатай бібліятэкі Храптовічаў, якія невядомыя «кнігалюбы» скуплялі за бясцэнь. Аднак сёння пра гэта нагадвае хіба што пыл гісторыі... Мясціна застаецца амаль нікім не заўважанай, але, падаецца, калі б нехта пачаў праводзіць там работы, вельмі рызыкаваў бы таксама трапіць пад раздачу «ўсенароднага гневу» ў сеціве.

Як той казаў, наша спадчына ў нашых руках. Не ўсю адказнасць трэба спіхваць на дзяржаву. Вельмі многае, маленькімі крокамі, маглі б зрабіць і звычайныя людзі, калі б паставілі перад сабой канкрэтныя мэты. Захаваем і ашчадна аднавім тое, што атрымалі ад продкаў ці пакінем нашчадкам сумную сцэнь ўрбаністычныя пляцоўкі, залежыць ад нас саміх.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

## Прывабныя руіны і Княская вежа

«Крэўскі замак цалкам аднаўлены быць не можа, бо няма ніякіх звестак пра яго гістарычнае аблічча, — адзначае **археолаг архітэктуры Ігар ЧАРНЯЎСКІ**. — Таму падрыхтаваны праект кансервацыі муроў з магчымай, пры наяўнасці сродкаў, рэканструкцыяй Княскай (паўночнай) вежы — гэта дазваляюць зрабіць яго вывы на здымках пачатку мінулага стагоддзя і матэрыялы натурных даследаванняў.

Удала пададзеная руіна з адпаведным уладкаваннем тэрыторыі можа быць вельмі інфармацыйнай і прывабнай. Гэта сусветная практыка, якая грунтуецца на захаванні дакументальных вартасцяў аб'екта. Такая практыка выпрацавана пакаленнямі прафесійных рэстаўратараў».

**Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Ігар ВЯРСОЦКІ адзначыў:**

— Мы звярнуліся ў Фонд Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва з просьбай выдзеліць фінансаванне для аднаўлення Крэўскага замка. На мінулым тыдні адбылося адпаведнае пасяджэнне. Папярэдне вырашана, што для гэтых мэт нам будзе выдзелена больш за 100 тысяч рублёў. Аднаўленне плануем распачаць з Княскай вежы, затым будуць праводзіцца іншыя работы... Увогуле ж гэты аб'ект мы не пакідалі без увагі. Летась усталявалі агароджу, каб не было свабоднага доступу: гэта небяспечна для жыцця — з-за камянёў, якія могуць адвальіцца. На навакольнай тэрыторыі падтрымліваем належны санітарны стан. Але на грошы, якія разлічваем атрымаць у хуткім часе, правядзём работы, якія будуць больш заўважнымі.


УНП 100039847

**Информация**
**о результатах финансово-хозяйственной деятельности**

# ОАО «МНИПИ» за 2016 г.

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**
**на 01.01.2017 г.**

| Наименование показателей | Код строки | На 31.12.2016 г. (тыс. руб.) | На 31.12.2015 г. (тыс. руб.) |
|---|---|---|---|
| 1. Долгосрочные активы | **190** | **10 614** | **10 284** |
| Основные средства | 110 | 9 287 | 9 124 |
| Нематериальные активы | 120 | 13 | 12 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 1 104 | 940 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 208 | 208 |
| 2. Краткосрочные активы | **290** | **5 116** | **3 068** |
| из них: | | | |
| сырье, материалы и др. аналогичные активы | 211 | 373 | 380 |
| затраты в незавершенном пр-ве и полуфабрикаты | 213 | 802 | 814 |
| готовая продукция и товары для реализации | 214 | 761 | 457 |
| Расходы будущих периодов, НДС, краткосрочная дебиторская задолженность | 230-250 | 1 116 | 951 |
| Денежные средства | 270 | 2 064 | 466 |
| **Баланс – всего (активы)** | **300** | **15 730** | **13 352** |
| 3. Собственный капитал | 490 | 12 904 | 11 812 |
| 4. Краткосрочные активы | 690 | 2 826 | 1 540 |
| в том числе: кредиторская задолженность по поставщикам и авансам полученным | 631-632 | 2 320 | 399 |
| по оплате труда | 635 | 120 | 116 |
| прочие краткосрочные обязательства | 633-670 | 386 | 1 025 |
| **Баланс – всего (пассивы)** | **700** | **15 730** | **13 352** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**
**за 2016 г.**

| Наименование показателей | 2016 г. (тыс. руб.) |
|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 6 753 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 6 023 |
| Прибыль от реализации | 730 |
| Прибыль (убыток) от прочей деятельности | (170) |
| Прибыль от инвестиционной деятельности | 353 |
| Прибыль от финансовой деятельности | 101 |
| **Прибыль до налогообложения** | **1 014** |
| Налоги, сборы и платежи из прибыли | (163) |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ** | **851** |

Получено аудиторское заключение ООО Аудиторский центр «Эрудит», которое дает заключение, что бухгалтерская отчетность ОАО «МНИПИ», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «МНИПИ» на 01 января 2017 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2016 г. При этом совершенные ОАО «МНИПИ» финансовые (хозяйственные) операции во всех существенных отношениях соответствуют законодательству.
ОАО «МНИПИ» объявляет о выплате дивидендов за 2016 год в размере 14 копеек на одну акцию. Выплата дивидендов производится в срок до 01 ноября 2017 года.



УНП 500167057

# ОАО «НеоТрейдЗапад»

Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: 29 марта 2017 года. Основным видом деятельности общества является сдача в наем собственного недвижимого имущества.

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ЗА 2016 ГОД**

| | | *млн руб.* |
|---|---|---|
| **Наименование статей** | **На 31.12.2016** | **На 31.12.2015** |
| I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ | 225 | 224 |
| II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ | 155 | 161 |
| БАЛАНС | **380** | **385** |
| **Собственный капитал и обязательства** | **На 31.12.2016** | **На 31.12.2015** |
| III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | **372** | **370** |
| Уставный капитал | 70 | 70 |
| Добавочный капитал | 272 | 273 |
| Нераспр. прибыль (непокрытый убыток) | 30 | 27 |
| IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | - | |
| V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | **8** | **15** |
| БАЛАНС | **380** | **385** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 2016 ГОД**

| Наименование показателей | На 31.12.2016 | На 31.12.2015 |
|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 46 | 44 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | (47) | (63) |
| Валовая прибыль | (1) | (19) |
| Управленческие расходы и расходы на реализацию | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | (1) | (19) |
| Прочие доходы по текущей деятельности | - | - |
| Прочие расходы по текущей деятельности | (3) | (7) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | (4) | (26) |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 4 | 8 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 1 | 35 |
| Расходы по финансовой деятельности | - | - |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | 5 | 11 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 1 | (15) |
| Налог на прибыль | (2) | (1) |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) | (1) | (16) |
| Совокупная прибыль (убыток) | (1) | (16) |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | - | - |



## ВАЖНЫЯ ЎРОКІ

Аднойчы настаўніца матэматыкі дала вучням незвычайнае заданне: «Падумайце, што вам больш за ўсё падабаецца ў кожным з аднакласнікаў, і запішыце гэтую якасць насупраць яго прозвішча». У канцы ўрока яна сабрала спісы. За выхадныя апрацавала вынікі і ў панядзелак раздала кожнаму вучню паперку, на якой пералічыла ўсё тое добрае, што заўважылі ў ім аднакласнікі.

...Праз некалькі гадоў адзін з тых вучняў загінуў у В'етнаме. Яго хавалі на радзіме. З Маркам прыйшлі развітацца сябры, былыя аднакласнікі, настаўнікі. Яго бацька падышоў да настаўніцы матэматыкі: «Гэта знайшлі ў рэчах Марка, — з кішэні ён дастаў складзеную ў чатыры разы, пацёртую на згінах паперку. Было бачна, што яе шмат разоў чыталі і перачытвалі. — Ён не разлучаўся з ёй. Пазнаяце?» Гэта быў спіс станоўчых якасцяў, якія заўважылі ў Марку аднакласнікі.

І тут здарылася дзіўнае: адзін за адным аднакласнікі Марка даставалі такія ж паперкі. Многія заўсёды трымалі іх пры сабе. Адзін з іх сказаў: «Мы ўсе захавалі гэтыя спісы. Хіба можна такое выкінуць?»

На днях я таксама знайшла ў сваім штодзённіку паперку, складзеную ў чатыры разы. На ёй зверху вялікімі літарамі было напісана: «МЯНЕ РАДУЕ». А ніжэй — лічбы ад 1 да 10 у слупок. Гэтую паперку мне дала адна жыццялюбка падчас інтэрв'ю. Па шчырасці некалькі разоў спрабавала яе запоўніць, але так і не змагла. І вось раніцай я ўспомніла пра той спіс. Зусім выпадкова.

На вуліцы было вельмі ветрана. Каб крыху сагрэцца, я забегла ў любімую кавярню. На століку знайшла інструкцыю: «Як быць шчаслівым?» Сярод дзясятка малюнкаў з подпісамі мне чамусьці ў вочы кінуўся «радуйся жыццю». Тут жа дастала са штодзённіка паперку. І запісала па гарачых слядах каля пункта 1.: «Зранку выходзіла з пад'езда. Прытрымала дзверы дзвюм школьніцам, якія прыехалі на вакацыі да бабулі. «Прывітанне, праходзьце». У адказ пачула нечаканае, беларускамоўнае «Дзякуй». Абрадавалася».

Падышла разлічыцца за гарбату з круасанам. Каля стойкі ўбачыла стыльную драўляную скарбонку з адтулінамі для манет рознай вартасці. «Гэта для чаявых?» — запыталася ў дабрадушнага бармена Валерыя. — «Не, збіраем грошы на корм для коцікаў, што жывуць у двары кавярні». — «О, цудоўная задумка», — абрадавалася я і кінула ў скарбонку пару манет.

Потым паехала на рэпартаж. У вагон метро зайшла жанчына з маленькім сынам. Было ўсяго адно вольнае месца. «Мама, сядай! Я пастаю», — сказаў хлопчык. Напэўна, яго тата заўсёды саступае месца маме, з усмешкай падумала я.

Потым напісала матэрыял пра цудоўны сацыяльны праект для асаблівых дзетак. І таксама на душы стала радасна. Ад адчування, што, магчыма, мой тэкст дапаможа добрай справе.

А ўвечары сястра даслала здымак з кранальным подпісам: «Хоць ты ўжо і не збіраеш анёлаў, але не змагла міма гэтага прайсці і не падумаць пра цябе. HOPE (гэта слова выгравіравана на анёлку. — **Аўт.**) — Надзея, і зялёны, і фрызура, як у цябе».

Карацей за дзень у мяне набралася значна больш за 10 нагодаў для радасці. Ад маленькіх да вялікіх.

...Школьнае заданне настаўніцы матэматыкі дапамагло вучням паверыць у сябе. Радасны ж практыкум нагадаў мне, што, аказваецца, гэта так проста — радавацца жыццю. Трэба ўсяго толькі прытрымлівацца парады Амара Хаяма: не спяшацца, смакаваць кожнае імгненне. І не трапляць у тры пасткі, якія крадуць радасць: шкадаванне аб мінулым, трывога за будучыню і няўдзячнасць за сучаснае.

***P. S.** Калі мы перяязджалі на новую кватэру, муж хацеў выкінуць мае ружовыя марлевыя крылы. Маўляў, у нас і так вельмі шмат рэчаў. «Хіба такое можна выкінуць?! Я ж у іх езджу час ад часу на ровары і дару ўсмешку людзям». Учора прыцягнула тыя крылы на працу, паклала на паліцу з падшыўкай «Сямейнай газеты». Пакуль везла іх, падарыла ўсмешку яшчэ некалькім дзясяткам мінакоў. Сяджу дапісваю гэтую калонку і радуюся.*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

# Сямейная газета

**Выпуск № 6 (73)**

■ Сустрэча без абцасаў

Алена МІКУЛЬЧЫК:

# «Калі жонка не адказвае ўзаемнасцю, прыгатуйце ёй страву з хрэнам»



Фота Надзеі БУЖАН.

**У бізнес-лэдзі і шэф-кухара Алены Мікульчык у жыцці два захапленні — кулінарыя і мода. Прыйшла яна на сустрэчу у стыльных сукенцы і паліто, пашытых уласнымі рукамі. Заказала ў кавярні яркую аўтарскую гарбату з апельсінам і імбірам. І расказала, як схуднець пры дапамозе беларускай кухні і чаму яна радавалася разводу сваіх бацькоў...**

***(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)***

■ Чалавек-чалавеку

# КІЛАМЕТРЫ ДАБРА

## Бізнесмен прыдумаў, як дапамагчы асаблівым сем'ям перамяшчацца па горадзе

**У мінчаніна Дзмітрыя КУХЦІНА ёсць уласная сям'я, бізнес, захапленні. А таксама вялікае і добрае сэрца. На працягу апошніх шасці гадоў малады чалавек, валанцёр Дзіцячага хоспіса, бясплатна на сваёй машыне вазіў дзяцей-інвалідаў па розных іх справах. «Я наматаў тысячы «кіламетраў дабра», але задавальнення не было. Час ідзе, а я разумею, што дапамагаю толькі некалькім сем'ям. А такіх сем'яў, якім патрэбна дапамога, шмат. Тым больш, у мяне работа. Я не заўсёды магу сарвацца ў любы момант. Так узнікла ідэя стварыць унікальны сэрвіс, дзе кожны можа дапамагчы і дзе кожнае дзіця з асаблівасцямі можа перамяшчацца куды захоча ў зручны час».**

**Ідэю Дзмітрыя падтрымалі не толькі жонка, калегі, сябры, але і зусім незнаёмыя энтузіясты. А ў суботу бясплатны сэрвіс таксі для дзяцей з асаблівасцямі развіцця стаў пераможцам Хакатону Social Weekend (конкурсу сацыяльных праектаў) і атрымаў фінансавую падтрымку.**



Фота Надзеі БУЖАН.

***— Як будзе працаваць сэрвіс «Кіламетры дабра»?*** — цікаўлюся ў Дзмітрыя.

— Вось наш сайт kilometry.by, — паказвае на мабільным тэлефоне. — Сям'я, якой трэба некуды дабрацца, рэгіструецца тут (сайт пакуль у распрацоўцы) і пакідае заяўку. Маўляў, нам раз-два на тыдзень трэба з'ездзіць па такім адрасе. Мы пралічваем колькасць кіламетраў і знаходзім добраахвотнікаў, якія хочуць дапамагчы аплаціць паездку. Спонсары (гэта можа быць любая фізічная ці юрыдычная асоба) пералічваюць грошы, і мы заказваем таксі. Глядзім, каб быў адпаведны аўтамабіль, у які, калі ёсць такая неабходнасць, змесціцца інвалідная каляска. Сталічная служба «Таксі пятніца» пагадзілася вазіць дзетак па зніжаным тарыфе. Але мы адкрытыя да супрацоўніцтва і з іншымі службамі. Таксіст вязе сям'ю па патрэбным адрасе. Мы кантралюем і аплачваем паездку. Затым дасылаем спонсару справаздачу. А за аплачаныя «кіламетры дабрыні» прапануем яму зніжкі і бонусы ў кампаніях-партнёрах сэрвісу. Чым больш «кіламетраў дабра» на рахунку, тым большы выбар зніжак і бонусаў.

На днях адбылася першая, тэставая паездка бясплатнага сэрвісу таксі для дзяцей з асаблівасцямі развіцця. У ёй узялі ўдзел і карэспандэнты «Звязды». Пад'ехаў на вуліцу Рагачоўскую, каб пракантраляваць першую паездку, і Дзмітрый Кухцін.

У 12.20 з пад'езда выходзіць Вольга Назарава з 6-гадовай дачушкай на руках. У Арыны складаны дыягназ: дзяўчынка не ходзіць і не размаўляе. Кіроўца таксі Андрэй дапамагае пасадзіць малую ў дзіцячае крэсла. Вольга вельмі хвалюецца: адразу відаць, не прывыкла да зносін з журналістамі. Кажа, што наогул мала кантактуе з грамадствам пасля нараджэння дачкі. Па дарозе даведваюся, што едуць яны да астэапата.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)***

■ Прыклад для пераймання

# ЛЯТУЧЫ КЛУБ

## Дзе маладыя мамы могуць падзяліцца сваімі праблемамі?

**Карысную ініцыятыву для жанчын, што знаходзяцца ў дэкрэце, запусцілі ў мінскім мікрараёне Брылевічы. На базе тэрытарыяльнага цэнтра сацабслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна запрацаваў «Лятучы клуб мам». Што гэта такое? Раз на тыдзень маладыя мамы збіраюцца, каб абмеркаваць праблемы, з якімі ім даводзіцца сутыкацца, даведацца пра досвед іншых бацькоў. На сустрэчы плануецца запрашаць таксама медыкаў, юрыстаў, псіхолагаў.**



Фота Надзеі БУЖАН.

На сустрэчы «Лятучага клуба мам» прыязджаюць жыхаркі не толькі Маскоўскага, але і іншых раёнаў сталіцы. Канструктар, мячыкі, машынкі — усё, каб дзеці не сумавалі.

### «ДОМА ЗАСЯДЗЕЛІСЯ»

Пачатак а 12-й раніцы. На сход клуба ўжо падцягнуліся першыя мамы. Жанчыны заварваюць чай і раскладаюць печыва: утульнасць перш за ўсё. У яркім пакоі, дзе праходзяць сустрэчы, сапраўды хатняя абстаноўка. Мяккія пуфікі, вялікі дыван, стэлажы з цацкамі, спавівальны столік. На сценах — героі вядомага савецкага мультфільма пра маманцяня. Упрыгожыць пакой дапамог мастак-валанцёр з суседняга праваслаўнага прыхода.

— Я пра клуб даведалася ад суседкі, — расказвае Таццяна, пакуль расшпільвае куртачку сваёй маленькай дачцэ. Ксеніі паўтара года, і яна вельмі актыўнае дзіця.

— Засядзеліся мы дома, — уздыхае Таццяна. — Таму цяпер ходзім па розных гуртках.

— А можа сустрэчы клуба будзем крыху пазней праводзіць? А то мы ледзь паспяваем, дзеці толькі нядаўна прачнуліся, — просяць некаторыя мамы.

Хрысціна на сённяшні сход прыехала адна. Дома з яе дзевяцімесячнай дачушкай засталася бабуля: у той якраз выхадны.

— Чаму прыходжу сюды? Тут абмяркоўваюцца цікавыя тэмы, — тлумачыць Хрысціна.

— Але ж многае можна і ў інтэрнэце пачытаць...

— У інтэрнэце шмат лішняй інфармацыі, можна так і не атрымаць адказ на сваё пытанне. А тут пытаешся наўпрост. Плюс спецыялісты на сустрэчах кансультуюць. А ў сеціве я ж не ведаю, хто артыкулы піша.

Маладая мама прызнаецца: калі пайшла ў дэкрэт, аддалілася ад многіх сябровак, у якіх няма дзяцей. А ў клубе набыла новае кола зносін. Тут яна можа параіцца з іншымі бацькамі, пачуць, як яны выхоўваюць сваіх малых.

Настасся — мама дзіцяці з асаблівасцямі ў развіцці. Сямігадовая Ксюша ходзіць у дзіцячы садок, у наступным годзе збіраецца ў школу, у інтэграваны клас. «Мы спецыяльна месца жыхарства змянілі дзеля школы, — дзеліцца Настасся. — У Маскоўскім раёне добра развітае безбар'ернае асяродзе».

Сама маладая мама займаецца валанцёрствам, грамадскай дзейнасцю. Цяпер да спіса спраў дадаліся і штотыднёвыя сходы ў тэрытарыяльным цэнтры.

**«У інтэрнэце шмат лішняй інфармацыі, можна так і не атрымаць адказ на сваё пытанне. А тут пытаешся наўпрост. Плюс спецыялісты на сустрэчах кансультуюць».**

— Клуб быў разлічаны на мам у дэкрэтным водпуску. Але мой дэкрэт, як і ў большасці жанчын з дзецьмі з асаблівасцямі ў развіцці, зацягнуўся, — усміхаецца Настасся. — Такія сустрэчы для мяне — гэта магчымасць падзяліцца досведам, набыць новыя кантакты.

### АД КАНСУЛЬТАЦЫЙ ДА ФЕСТЫВАЛЯЎ ДВАРА

На адкрыццё «Лятучага клуба мам» натхніў вопыт Польшчы. Там, у горадзе Мілянувек, падобны праект запусцілі гадоў сем таму.

— Жанчыны, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці, крыху выключаны са звыклага для іх жыцця. А такая кансалідацыя мам, узаемападтрымка дапамагаюць перажыць гэты перыяд, — тлумачыць неабходнасць клуба **дырэктар тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна Мінска Алена ДЗЯМІДАВА**. — Так атрымалася, што ў групе сабраліся і мамы з асаблівымі дзецьмі. І яны былі добра прыняты. Цудоўна, што акрамя пытанняў, якія датычацца ўсіх, праблемы інклюзіі не засталіся збоку.

Тэмы для сустрэч падказваюць самі мамы. Сёння, напрыклад, яны захацелі пагаварыць пра тое, як змагацца з дэпрэсіяй. Хоць хутка пераключыліся на рэчы яшчэ больш надзённыя: талончыкі да ўрача. Вось дзе сапраўды карысна пачуць досвед «бывалых».

У тэрытарыяльным цэнтры кажуць, што гатовы абмяркоўваць з маладымі мамамі пытанні і дадатковай адукацыі, і выхавання дзяцей. І нават тэмы, што не датычацца малых. Напрыклад, запрасіць на сустрэчу стыліста ці візажыста.

— Для дзяцей адкрыта шмат развіваючых цэнтраў, а для мам — амаль нічога. Большасць часу яны аддаюць малым, а пра сябе забываюць. Праз гэта паўстаюць псіхалагічныя праблемы. Клуб — гэта прастора, дзе можна сустрэць аднадумцаў. І дзіця будзе побач: пакой абсталяваны так, каб малым было чым заняцца, — кажа **псіхолаг-кансультант цэнтра Хрысціна МУХІНА-ГЕВАРГЯН**, якая праводзіць сустрэчы клуба.

Ініцыятыву ўспрынялі на ўра. Што не дзіўна: Маскоўскі раён — малады, тут жыве шмат бацькоў з малечамі. Больш за 50 сем'яў выхоўваюць дзяцей-інвалідаў да трох гадоў.

Яшчэ адна мэта праекта — падштурхнуць мам быць больш ініцыятыўнымі. Так, у Польшчы актыўныя гараджанкі стварылі спецыяльны сэрвіс з інфармацыяй аб якасці дзіцячых пляцовак.

— Жанчыны ў дэкрэтным водпуску валодаюць пэўнымі рэсурсамі. У іх ёсць час і спецыяльныя навыкі ў розных сферах. Хочам стварыць умовы, каб маладыя мамы аб'ядноўваліся і выразалі пытанні, якія іх хвалююць, — адзначае Алена Дзямідава. — Мы адкрыты для прапаноў. Абменьвацца рэчамі, праводзіць фестывалі двара — калі ласка. Калі хтосьці захоча гэта арганізаваць, мы дапаможам.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■

# КІЛАМЕТРЫ ДАБРА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)***

— Нам пашанцавала сустрэць спецыяліста такога маштабу. Асаблівых дзяцей ён прымае бясплатна. Бясплатны сервіс, які прыдумаў Дзіма, на мой погляд, вельмі неабходны. Пенсія па інваліднасці — невялікая. Таму гэта істотная падтрымка бацькам такіх дзетак. Калі на дзяржаўным сацыяльным таксі, якое ёсць у нашым горадзе, напісана «Свет без межаў», то, напэўна, гэта не зусім так. У тым праекце ўсё ж такі ёсць абмежаванні. Яно возіць толькі ў дзяржаўныя бальніцы і паліклінікі. Любыя ж бацькі шукаюць спецыяліста з досведам, які дапаможа. І, магчыма, гэты доктар, якому яны даваряюць, будзе працаваць не ў дзяржаўнай медустанове. Як у маім выпадку. Я вельмі доўга шукала лагапеда для Арыны. Мала ў нас спецыялістаў, якія могуць справіцца з такой паталогіяй. Зноў-такі пашчасціла: знайшла цудоўнага доктара. Я давяраю яму, бо бачыла складаных дзяцей, якія пасля некалькіх гадоў рэгулярных заняткаў пачалі гаварыць першыя словы. Але ён таксама працуе прыватна...

У нашым Першамайскім раёне сацыяльнае таксі прадастаўляе адной сям'і пяць бясплатных паездак у месяц. Нам жа трэба наведваць рэгулярна некалькіх спецыялістаў: два разы на тыдзень — лагапеда, тры разы — ЛФК...

Акрамя таго, трэба загадзя сказаць аператару дакладны час знаходжання ў паліклініцы. На форумах для асаблівых дзяцей пішуць, што былі выпадкі, калі сацыяльнае таксі з'язджала, бо чалавек затрымліваўся хвілін на 5—10. Складана нешта дакладна спланаваць, да кожнай секунды. Гэта ж дзіця, чарга... Асабіста я сутыкнулася з іншай сітуацыяй. У цябе талончык на 12.00, а ў тэрытарыяльным цэнтры кажуць: «Машына адвязе, але праз гадзіну яна вас забраць не зможа, бо ў гэты час вязём пацыентаў на гемадыяліз. Па вас мы можам заехаць... Зараз пагляджу... У 15.00».

На жаль, я ў свой час не навучылася кіраваць машынай. А цяпер з такім дзіцем гэта практычна нерэальна. Не магу пакінуць Арыну адну.

Я вельмі ўдзячна Дзіму. Гэта неверагодны чалавек. Апошні год ён нас рэгулярна і зусім бясплатна вазіў на сваёй машыне да лагапеда. Ён проста адной сваёй прысутнасцю падтрымлівае мяне. Яго словы, якія чула падчас паездак, неаднаразова дапамагалі мне ў складаных сітуацыях не апусціць рукі.

— Ну, як уражанні ад першай паездкі? — цікаўлюся на развітанне ў Вольгі Назаравай.

— Нам вельмі спадабалася. Пачынаючы ад знешняга выгляду кіроўцы таксі Андрэя, заканчваючы размовай. Ветлівы, выхаваны чалавек. Усё было вельмі добра, хутка. Калі праект «Кіламетры дабра» атрымае падтрымку — гэта будзе насамрэч акно ў свет для такіх сем'яў, як наша.

— Толькі ў Мінску каля 10 тысяч асаблівых дзетак. Мне вельмі хочацца, каб іх жыццё не абмяжоўвалася выключна бальніцамі і паліклінікамі, — падхоплівае Дзмітрый Кухцін. — Таму, калі сям'я захоча паехаць на нейкае культурнае мерапрыемства, наведаць кінатэатр ці басейн, сустрэцца з сябрамі, мы не будзем абмяжоўваць. Мэта сэрвісу «Кіламетры дабра» — рассунуць межы магчымасцяў такіх дзетак. І каб гэта было абсалютна бясплатна.



Фота Надзеі БУЖАН.

Пасля таго, як мы здзейснілі першую паездку, пасыпаліся званкі ад іншых бацькоў, якія выхоўваюць дзетак з асаблівымі патрэбамі. Пакідаюць свае заяўкі. Ужо праз год мы плануем ахапіць большасць мінскіх сем'яў. А потым, глядзіш, і іншыя гарады Беларусі.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.** *nadzieja@zviazda.by*

# ПАГУЛЯЙ СА МНОЮ, ТАТА!

## Як і чым бацька можа заняць дзіця

**Што рабіць, застаўшыся з дзіцем сам-насам? Часта гэта становіцца праблемай нават для самых упэўненых у сабе мужчын. Бо ліха яго ведае, якія гульні можна прыдумаць для маленькага «камячка шчасця». Хоць калі разабрацца, то мы, мужчыны, у глыбіні душы самі застаёмся дзецьмі, толькі «цацкі» з цягам часу мяняюцца. І калі даць волю свайму ўнутранаму дзіцяці — усё наладзіцца. У гэтым упэўнены шматдзетны бацька Сяргей КУРКАЧ. Больш за тое: ён пераканаsuccessful, што праз гульні мы, дарослыя, рыхтуем дзяцей да самастойнага жыцця. Свой погляд на гульні з малымі мае і яго калега Валянцін БОЙКА. «Чым тата можа заняць дзіця?» — гэтай тэме прысвечана чарговае пасяджэнне нашага «Бацькоўскага клуба».**

Шматдзетны Куркач (справа) дае майстар-клас малодшаму калегу.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

### ТАТА — НАЙЛЕПШЫ БАТУТ

**В.Б.:** Упершыню з неабходнасцю чымсьці заняць дзіця я сутыкнуўся, калі жонка выйшла з «дэкрэту». Калі сын хварэў, яна няшмат брала бальнічны, бо ў яе на рабоце быў бы завал. І я, маючы больш свабодны графік, часта сядзеў з малым. Пакарміць, умыць, пасадзіць на гаршчок — з гэтым праблемы не было. Але ж дзіцяці патрэбны і нейкі занятак, нейкія гульні. Самае відавочнае рашэнне — надаваць яму цацак, каб рукі былі занятыя. Ды цацкі мы ігнаравалі змалку. Затое нас вабілі каструлі, абутак, татавы інструменты і г. д. Тое, з чым гуляць не толькі непажадана, але і нават небяспечна. Таму дзіцячую ўвагу трэба было займаць чым-небудзь іншым.

**С.К.:** У маёй старэйшай дачкі ў гэтым узросце цацак увогуле было небагата. Бо час для нашай маладой сям'і быў нялёгкі. Дый такога выбару цацак, як цяпер, не было. Але для дзіцяці, на маю думку, ва ўзросце 3—4 гадоў больш важны фізічны кантакт. Бо праз тактыльныя адчуванні дзеці спазнаюць свет. Мы з дачкой гулялі так: яна заплюшчвала вочы, а я вельмі лёгка дакранаўся да яе рукі, нагі, носіка і г.д. А яна мусіла сказаць, да якой часткі цела я дакрануўся. Гэта развівала не толькі тактыльныя адчуванні, але і слоўнікавы запас.

> **«Дзеці бываюць маленькімі толькі адзін раз. І якія ўспаміны яны вынесуць са свайго маленства? Мадэль бацькавага тэлефона?»**

**В.Б.:** Майму сыну ўжо амаль 7 гадоў, але кантактныя гульні ў нас дагэтуль актуальныя. Прычым ад мяне асаблівых намаганняў не патрабуецца. Калі стомлены тата падае на канапу, на яго навальваюць падушкі і з радаснымі воклічамі скачуць зверху. Весялей, чым на батуце. Або мы пачынаем тузаць адзін аднаго, жартам біца, качацца па падлозе. Здавалася б, элементарная рэч, а дзіця ў захапленні. Бо яго энергія патрабуе выхаду. Бывае, што сын просіць, каб я пакатаў яго на плячах. Вялікіх разумовых намаганняў ад таты гэта не патрабуе, а дзіцяці радасць.

### У ГАСЦЯХ У КАЗКІ

**С.К.:** Гэта ўсё выдатна, але ў сем гадоў пара ўжо пераходзіць на новы ўзровень. Я параіў бы што-небудзь развівальнае. Самае даступнае — пачытаць дзіцяці казку. Выразна, на розныя галасы. Менавіта ў бацькі найлепей выйдзе імітаваць голас ваўка, які прыйшоў з'есці казлянятаў. Дый танюткім галаскам, калі пастарацца, можна пагаварыць. Трохі смешна выходзіць, але дзіцяці даспадобы!

**В.Б.:** Я свайму таксама чытаю кніжкі. Але значнасць тактыльных гульняў нельга недаацэньваць. Бо калі мы перастаём абдымаць дзіця, гладзіць яго па галаве, калі лічым, што яно ўжо занадта дарослае для пяшчоты, то робім вялікую памылку. Калі дзіця хоча прытуліцца да таты або мамы — падчас гульні ці проста так — не трэба яму перашкаджаць. І не важна, колькі яму гадоў: тры або трынаццаць.

### ЗРАБІ САМ І НАВУЧЫ СЫНА

**С.К.:** Калі дзіця падрастае, яму патрэбныя і прадметныя гульні: кубікі, машынкі, мячыкі, канструктары. Добра, калі ў гульні ёсць элемент «зрабі сам». Напрыклад, мой сын любіў гуляць з цацачным аўтобусам. Але ж аўтобусу быў патрэбны гараж, які мы разам змайстравалі з кардону. І тут важна, каб дзіця само прымала ў гэтым удзел: выразала, клеіла, падпісвала.

**В.Б.:** У нас з сынам таксама бываюць падобныя забаўкі. Аднойчы ён захацеў зрабіць цацачны акварыум. Мы дасталі з балкона кардонную ўпакоўку ад канапы і сталі выразаць з яе «вуглікі». Пасля скляпалі іх стэплерам — і выйшаў каркас. З кардону зрабілі днішча. Уверсе нацягнулі лёску і падвесілі пластмасавых рыбак. Сыну вельмі спадабалася. Адна толькі праблема: ён не вельмі ахвотна бярэ ўдзел у працэсе. Збольшага назірае, як гэта робіць бацька.

**С.К.:** Калі гаворка пра складаныя маніпуляцыі, то гэта нармальна, калі імі займаецца бацька. Але ў астатнім дзіця мусіць быць задзейнічана, інакш яно застаецца простым гледачом. Карысці ад такой гульні мала. І зробленую рэч ён хутка забудзе, не стане ёй даражыць. Напрыклад, у нас ёсць і электрычная чыгунка, і машынка на радыёкіраванні, але аўтобус, на які дзіця само наклеіла нумар і для якога само зрабіла гараж, усё адно застаецца цацкай нумар адзін.

### ЗРАЗУМЕЙ МЯНЕ

**В.Б.:** У майго сына педагогі адзначаюць добры слоўнікавы запас, развітое маўленне. Але ён дагэтуль не вывучыў назвы месяцаў. І не таму, што не можа, а проста лянуецца. Таму паўстае праблема развіцця памяці, увагі, але так, каб дзіцяці самому было цікава.

**С.К.:** А паспрабуй з ім гульню «Адгадай». Гуляць у яе можна дзе заўгодна і калі заўгодна: дома, перад сном, на аўтобусным прыпынку, у самім аўтобусе і г. д. Адзін гулец загадвае прадмет. Другі павінен яго адгадаць. Для гэтага ён можа задаваць пытанні, на якія трэба адказваць толькі «так» ці «не». Напрыклад, мой сын загадаў цукерку. Каб адгадаць, тата спачатку спытаў, ці можна гэта есці. Атрымаўшы станоўчы адказ, я пытаюся: "Гэта салёнае?" — «Не». — «Гэта салодкае?» — «Так!» — «Ты гэта любіш?» — «Так». — «Цукерка!»

Пачыналі мы з самых простых прадметаў, але спакваля тэмы ўскладняліся. Дайшло да таго, што дачка загадала паняцці «вакуум» і «Сусвет». І гэтым разам тату давялося добра пасушыць мазгі. Але і дзіцяці траплялося складаныя задачы.

**В.Б.:** А майму дзіцяці больш даспадобы гульні з канкрэтнымі прадметамі. Мы звычайна выкладваем на стале з дзясятак розных рэчаў: ручку, мабільны тэлефон, лыжку, цацку і іншае. Пасля сын называе ўсё па парадку, заплюшчвае вочы, а я хаваю адзін прадмет, а астатнія мяняю месцамі. І дзіця павінна адгадаць, што я прыбраў. Для гэтай гульні можна таксама выкарыстоўваць каляровыя фламастары або алоўкі. Яна добра развівае памяць і ўважлівасць. Прычым абавязкова трэба чаргавацца: спачатку тата «вядзе» ў гульні, пасля — дзіця.

А яшчэ мой сын дужа любіць гуляць у хованкі. І мне з маім ростам больш за метр восемдзесят даводзіцца шукаць у кватэры месцы, куды можна схавацца. І яны знаходзяцца! Гульня, здавалася б, старая, як свет, але развівае прасторавыя ўяўленні.

**С.К.:** Гэта, канешне, выдатна. Але калі хлопчык падрастае, у гульнях павінен з'яўляцца элемент спаборніцтва. Бо ў будучым мужчыну важна развіваць ініцыятыўнасць, імкненне перамагаць, дасягаць сваіх мэт. Мой сын вельмі любіць настольны футбол, які не толькі развівае маторыку, але і вучыць стратэгіі, тактыцы змагання з рэальным супернікам. І на прыкладзе гэтай гульні я патлумачыў сыну, што перамагчы моцнага працаўніка (такога, як я) складана, але магчыма. І што ў рэальным жыцці могуць быць не толькі перамогі, але і паражэнні. Але не бяда, бо нездарма кажуць, што за аднаго бітага двух нябітых даюць. І годна прайграваць таксама трэба ўмець. А пройгрыш трэба аналізаваць і рабіць вывады.

### «НА ПРАСТОР, НА ШЫРОКІ РАЗЛОГ...»

**В.Б.:** Мяне як бацьку таксама хвалюе пытанне фізічнага развіцця дзіцяці. Бо тых заняткаў фізкультурай, што ладзяцца ў дзіцячым садку, відавочна мала. Усё ж хочацца выгадаваць гарманічна развітую асобу, а не хатнюю «расліну»...

> **«У нас ёсць і электрычная чыгунка, і машынка на радыёкіраванні, але аўтобус, на які дзіця само наклеіла нумар і для якога само зрабіла гараж, усё адно застаецца цацкай нумар адзін».**

**С.К.:** А ты сам адціскаешся ад падлогі штодня? Турнік ёсць у хаце? Якія-небудзь гантэлі? Ты сам чымсьці такім карыстаешся? Напрыклад, мы з сынам у вольную хвіліну разам адціскаемся. Спачатку яму было цяжка, але цяпер ён робіць гэтае практыкаванне бадай што нароўні са мной.

**В.Б.:** Турніка ў мяне няма. Але дома ёсць штанга, з якой я рэгулярна займаюся.

**С.К.:** Ці не зарана для малога — штанга?

**В.Б.:** Я кажу пра ўласны прыклад. Дзіця так ці інакш бачыць, што бацька цягае жалеззе, цікавіцца, навошта гэта трэба. Хай сабе штангу ён пакуль не падніме. Але маленькія гантэлі яму па сілах.

**С.К.:** А чаго мы зацыкліліся на кватэры? Малому патрэбны мяч, бадмінтонавыя ракеткі, ролікі, веласіпед... Нельга ўвесь час сядзець у хаце! Трэба на свежае паветра, «на прастор, на шырокі разлог». Я ў маленстве днямі прападаў у двары, гуляў з аднагодкамі. Дарэчы, дзіцяці трэба абавязкова кантактаваць з равеснікамі, асабліва калі гэтае дзіця адно ў сям'і (гэта твой выпадак). Каб малое, калі падрасце, не толькі ў інтэрнэце час бавіла.

**В.Б.:** Інтэрнэт і кампʼютары — гэта не так ужо і кепска. Хоць мы з жонкай свайго сына да доўгі час да кампʼютара не падпускалі. Ён толькі мульцікі з інтэрнэту глядзеў. Але цяпер у яго абуджаецца цікавасць. Яшчэ толкам не навучыўшыся чытаць і пісаць, ён стаў прасіць, каб я адкрываў яму тэкставы рэдактар. І ён сядзіць, нешта «набірае». Таксама сын ведае, што такое «Скайп», што па ім можна пагаварыць з дзядулем і бабуляй. І пра інтэрнэт таксама мае ўяўленне. Часам нават гуляе ў нескладаныя гульні. Але да кампʼютара дзіця сядае толькі пад маім або жончыным наглядам.

> **«Калі дзіця хоча прытуліцца да таты або мамы — падчас гульні ці проста так — не трэба яму перашкаджаць. І не важна, колькі яму гадоў: тры або трынаццаць».**

**С.К.:** Ад сучасных тэхналогій нікуды не схаваешся. Бачыў нават бабулек, што жвава тыкаюць пальцамі ў сучасныя смартфоны. Нешта забараняць — бясплённа і недарэчна. Лепей самому выбраць дзіцяці гульню. Не такую, дзе трэба тупа махаць мячом або страляць налева і направа, дзе кроў свішча. Я свайму сыну на яго смартфон усталяваў гульні са складаннем слоў, разгадваннем крыжаванак. Яшчэ малы цікавіцца геаграфіяй, і для яго знайшлася гульня, дзе правяраецца веданне гарадоў, сталіц розных краін.

**В.Б.:** Але для кампʼютараў і гаджэтаў ёсць свае разумныя «дозы». Хоць многія таты робяць проста: сунуў дзіцяці тэлефон, каб не назаляла, — і займаюцца сваімі справамі. Гэта ў прынцыпе няправільна. Па-першае, у малога ўзнікае залежнасць. Па-другое, вы ўпускаеце магчымасць наладзіць эмацыянальны кантакт з дзіцем. А дзеці бываюць маленькімі толькі адзін раз. І якія ўспаміны яны вынесуць са свайго маленства? Мадэль бацькавага тэлефона?

**С.К.:** Калі тату здаецца, што ў яго няма здольнасцяў, каб заняць дзіця нечым цікавым, гэта сведчыць не аб адсутнасці фантазіі, а аб самаапраўданні ўласнай ляноты. Так, усе мы стамляемся на працы. Але гульня з малымі — гэта мадэляванне розных сітуацый і падрыхтоўка да самастойнага жыцця.

**В.Б.:** І прафілактыка адчужанасці паміж татам і дзецьмі.

**С.К.:** Зануда! Годзе ўжо гаманіць. Давай у настольны футбол згуляем.

# «Калі жонка не адказвае ўзаемнасцю, прыгатуйце ёй страву з хрэнам»

## Пра 65-ы памер, кнігу са сметніцы і яечню на сале

**Усё пачалося з бліноў прабабулі.** У гонар апошняй мяне і назвалі — Аленай. Яна цудоўна гатавала. А вось матуля — не. Лёгка навучыць дзіця гатаваць, калі сам добра гэта робіш. А вось як навучыць, калі сам ненавідзіш стаяць каля пліты? Што рабіла мая маці? Яна адкрывала кулінарную кнігу ці брала выразку з газеты: «Ну што, дачушка, давай мы з табой спячом пірог. Вазьмі шклянку мукі, дадай тры яйкі...»

**Малодшая сястра маёй матулі — па прафесіі кухар.** Прычым такі, як мае быць, 65-га памеру. Неяк раз цётка кажа: «Даражэнькая ты мая пляменніца, вельмі добра падумай: што для цябе важнейшае — тонкая талія ці прафесія кухара». Пасля гэтых слоў я свой дыплом кухара роўненька паклала на паліцу. І пайшла вучыцца на дызайнера верхняга мужчынскага адзення. Паралельна атрымала яшчэ адну адукацыю — эканамічную, якая дапамагае мне распяхова весці свой бізнес.

**Гадоў 17 таму я выпадкова знайшла кнігу.** Валялася яна каля сметніцы, без вокладкі, з абпаленымі старонкамі. Мяне вучылі, што з хлебам і з кнігай так абыходзіцца нельга. Таму я падняла яе. Кніга была выдадзена дзесьці ў 1950-я гады. А ў ёй — рэцэпты 1860 года. Так пачалося маё знаёмства са старажытнай беларускай кухняй.

**Якое было маё здзіўленне, калі зразумела,** што старажытная беларуская кухня ніяк не шкодзіць фігуры. Я гатавала, ела і не папраўлялася. І я стала вывучаць, капаць глыбей. Ёсць пяць відаў беларускай кухні: сялянская, гарадская, карчомная, шляхецкая і каралеўская. Але большасць ведаюць толькі першую. Галоўная яе мэта — хутка і высокакаларыйна накарміць вялікую колькасць людзей. Таму і ўзнік міф, што беларуская кухня тлустая і ад яе папраўляюцца. Але ж усе забываюць, што калі нашы продкі гатавалі тую ж яечню на сале, то рабілі гэта выключна раніцай, каб былі сілы працаваць. А мы паелі — і на канапу... Таму, калі вы прыехалі ў вёску, то смела ешце на сняданак дранікі, сала, яйкі, тлустую мачанку з тоўстымі блінамі — і ідзіце дапамагаць бабулі на агародзе. І тады, паверце, ніякіх лішніх кілаграмаў не будзе. А ўвечары бабуля адварыць бульбы і паставіць свежага малака...

**Я — сава, мая актыўнасць прыпадае на другую палову дня.** Я ж і адкрыла сваё атэлье менавіта таму, што мне цяжка рана ўставаць. Хацела прачынацца тады, калі я хачу. І працаваць, калі хачу. Калі паступіла ў інстытут, ні разу не прыйшла на першую пару. Нават калі экзамен ставілі ў 8 гадзін раніцы, я здавала яго з іншай групай. Лічу, што не варта ламаць сябе. Лепш мяняць абставіны пад сябе.

## Пра антыдэпрэсанты, кавун для Хадоркі і іней на дрэвах

**Калі раптам будзеце ўвечары ў раёне вуліцы Прытыцкага ў Мінску** (я там жыву)... Ідзе дождж ці снег, і ўсе, незадаволеныя, спяшаюцца дадому, а адна вар'ятка бяжыць, не сумнявайцеся — гэта я.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Бегаю ўжо гадоў 15, як мінімум тры разы на тыдзень. Спачатку гэта было для фігуры. А цяпер — больш для мазгоў.

**Калі вы прыехалі ў вёску, то смела ешце на сняданак дранікі, сала, яйкі, тлустую мачанку з тоўстымі блінамі — і ідзіце дапамагаць бабулі на агародзе. І тады, паверце, ніякіх лішніх кілаграмаў не будзе.**

**Праца кухара вельмі стрэсавая.** Нервы трэба вельмі моцныя. А калі яшчэ, як у маім выпадку, свой рэстаранны бізнес... Сяброўка прыехала з Амерыкі і здзіўляецца: «Ты штодзень такія сур'ёзныя пытанні вырашаеш, і пры гэтым такая спакойная. Каліся, што ты п'еш, якія антыдэпрэсанты?» Бег — мой антыдэпрэсант. Бяжыш, любуешся прыродай, дыханне роўнае, думкі чыстыя-чыстыя... Калі не магла вырашыць нейкае пытанне, то на 7—8-ым кіламетры ўсё вырашаецца.

**У нас у родзе ўсе жанчыны жывуць доўга.** Адной маёй прабабулі было 92 гады, калі яна пакінула гэты свет. Другой — Хадорцы — 102. У яе не было ніводнага сівога валаска. Аднойчы яна сказала: «Усё, дзеткі, мне надакучыла жыць, усе мае сяброўкі памерлі, я таксама хутка памру». Прабабуля вельмі любіла кавуны. Таму мы хуценька пабеглі на Камароўку і знайшлі самы прыгожы і сакавіты. Прывезлі, яна паела: «Ну добра, — кажа, — яшчэ год пражыву».

**Сакрэт доўгажыхарства — не толькі ў здаровым харчаванні.** Перш за ўсё ў любові да жыцця, аптымізме, актыўнасці. Маёй матулі 63 гады. Дык у яе раскладзе яшчэ час трэба знайсці. Лазня, шэйпінг, тэатр, сустрэчы з сяброўкамі, лячэбная гімнастыка... Пры гэтым яна яшчэ працуе. Ідзе вельмі рана на работу. Неяк узімку ўбачыла іней на дрэвах і тэлефануе. «Мама, я сплю», — бурчу незадаволена. — «Ты не разумееш, якая тут прыгажосць!»

**У мяне ёсць добрая сяброўка** — Альбіна Пажаева. Ёй — 77. Сем гадоў таму яна разам з іншымі актыўнымі бабулямі запісалася на танцы. Знайшоўся харэограф, таксама пенсіянер. Я іх не так даўно да сябе ў рэстарацыю запрашала танцаваць. Гэта нешта неверагоднае! Мая ж матуля кажа: я яшчэ занадта маладая, крыху папрацую, а ў 70 гадоў таксама пайду танцаваць.

**Мама другі раз замужам.** Ведалі б вы, як я радавалася, калі бацькі разышліся! Мне тады было 14. У мяне цудоўныя адносіны як з маці, так і з татам. Самая вялізная памылка дарослых, якія больш не кахаюць адно аднаго, — працягваць жыць разам выключна дзеля дзіцяці. Мала таго, што малеча бачыць няправільную схему адносін, дык яны яшчэ і самі пакутуюць.



## Пра майстра спорту па джыу-джыцу, «так не бывае» і сына Ванечку

**Калі вы заўважылі, у мяне ў інтэрнэце няма ніводнага здымка з маёй сям'ёй.** Нічога асабістага. Усё толькі прафесійнае. Адзінае, што я сабе дазволіла апошнім часам: расказала, што ў мяне ёсць прыёмная дачка. Мы ўжо засвяціліся ў свецкай хроніцы. Нават блізкае кола не ведала пра гэта. «У цябе дачка ёсць?» — пытаюцца. 6 гадоў яна ў мяне. Я лічыла, што для Галюні будзе дрэнна, калі пра яе даведаюцца. Трэба, каб дзіця расло сціплым. У маі дачцэ споўніцца 18, я яе ўжо два разы брала на афіцыйныя мерапрыемствы, каб яна больш упэўнена сябе адчувала, вучылася размаўляць з незнаёмымі людзьмі. Галя ведае, што не родная нам. Калі была маленькая, казала: «А можа, ты мяне нарадзіла і забылася?» Цяпер для яе вельмі важна, каб я перад грамадскасцю пацвердзіла, што яна мая дачка.

**На адным дабрачынным мерапрыемстве мне пашчасціла пазнаёміцца з дырэктарам Ашмянскай школы-інтэрната.** Абаянне ў яго (*Уладзіміра Бізюка*.— **Аўт.**) — вышэй за жаночкае. Як казаў Жванецкі, «так не бывае». Кажа: «Мы для нашых дзетак зрабілі маленькія куханькі, але ж яны не ўмеюць гатаваць. Не мне ж вучыць: я нават яечню прыгатаваць не магу. Прыедзьце, навучыце». Так з'явіўся дабрачынны праект «Кулінарыя плюс». Ён жыве ўжо 6 гадоў. Мае бацькі далучыліся. Мы ездзім у Ашмяны кожны месяц з нейкай цікавай праграмай. І кожны раз штосьці разам з дзеткамі гатуем.

**Пакуль мы гатавалі,** прыбілася да мяне 11-гадовая дзяўчынка. Не адыходзіла ні на крок. Я афарміла дакументы і запрасіла Галюню да сябе ў госці на выхадныя. Потым яна праводзіла ў нас кожныя канікулы. Зараз Галя вучыцца ў Мінску, жыве ўжо з намі.

**Галюня не першая дзяўчынка, якая мяне выбрала.** Да яе была Анюта. Ёй было 16, калі мы пазнаёміліся. Яна пастаянна да нас прыязджала. На выпускны я падарыла Ганульцы сваю самую прыгожую сукенку. Мой гардэробчык даўно ўжо перакачаваў у Ашмяны (*усміхаецца*). Я ніколі не была для Анюты мамай, мы з ёй, як сястрычкі. Яна так і называе мяне. Калі яна выходзіла замуж, усе госці былі ўпэўнены, што я — яе родная сястра, а мае бацькі — бабуля з дзядулем.



**Першы мой муж** — добры чалавек, але ён не прыняў чужое дзіця. Як і мой дабрачынны праект. Увогуле лічыў гэта марнаваннем часу і сродкаў, што няма сэнсу ў гэтых дзяцей укладаць. Кожны пайшоў сваім шляхам. А з другім мужам я пазнаёмілася пасля разводу. Ён быў удзельнікам майго дабрачыннага праекта. Тэмай чарговай паездкі былі ўсходнія адзінаборствы. І я шукала спартсменаў. Сябры параілі: «Ёсць добры хлопец, майстар-спорту па джыу-джыцу, трэнер, псіхолаг. Ён табе не адмовіць паехаць да дзяцей, правесці майстар-клас». Сапраўды, не адмовіў (*смяецца*). І Галю прыняў адразу. Мы яе не прымушалі, яна сама татам яго стала называць.

**Нядаўна прыбіўся яшчэ хлопчык.** Ванечка. Галя адобрыла. Вось на днях афармілі на яго дакументы. Першы раз паедзе да нас у госці. Мы ўсёй сям'ёй селі і вырашылі, што дзяўчынак у нас дастаткова ў сям'і. Трэба хлопчык. Мне вельмі падабаецца, што дзяцей разбіраюць. За 6 гадоў многіх усынавілі.

## Пра тушонку з чорным хлебам, аўсяны кісель і афрадызіяк

**Майму мужу абсалютна ўсё роўна, што есці.** Калі я з'язджаю ў камандзіроўку, ён ідзе ў краму і купляе тушонку. Уплятае яе з чорным хлебам — і шчасце яго бязмернае. Дачка ж любіць паласавацца, але я ўжо гляджу, каб яна сама гатавала. Таму далікатэсы я гатую для сябе ў першую чаргу. Вельмі часта адпрацоўваю на сабе новыя рэцэпты, новую падачу.

**Я ніколі не куплю** чыпсы, маянэз, кетчуп, каўбасу... Часта езджу ў кулінарныя экспедыцыі. Дык пасля каўбас пальцам пханых, якія гатуюць бабулі, каўбасу з крамы есці проста немагчыма. Навошта набываць тыя ж тарты, булачкі, піроржныя, калі я раблю смачнейшыя? Ніколі не спакушуся на салодкія газаваныя напоі. Навошта марнаваць грошы на хімію? Тым больш, што можа быць карысней за самаробны морс з журавін з лімончыкам і карыцай ці жывы кісель на аўсянай заквасцы?!

**Аўсяны кісель нашы продкі елі часта і з задавальненнем.** Але сучасны чалавек, калі пакаштуе чысты яго смак, скажа: «Ну і брыдота! Як гэта можна есці?» Таму я распрацавала кактэйль на аснове аўсянага кісялю, калі да яго дадаюцца вяршкі, мёд, карыца і мята. Гэты напой надзвычай карысны для скуры, паляпшае абмен рэчываў у арганізме. Таму, калі хтосьці хоча пахудзець, — абавязкова раю. Таксама ён добры пры застоллі: калі шмат ежы, выпіўкі, апошнім падайце кісель — тады ў вас і вашых гасцей ніколі не будзе адчування цяжкасці ў страўніку. Мая мара — выпускаць аўсяны кісель і прадаваць яго як пітны ёгурт.

**Хрэн — вельмі моцны афрадызіяк.** Калі яго пастаянна ўжываць, гэта добра як для мужчын, так і для жанчын. Нават у старажытных кнігах напісана: калі жонка не адказвае вам узаемнасцю, прыгатуйце ёй страву з хрэнам. У XIX стагоддзі нашы продкі яго выкарыстоўвалі, як мы зараз моркву. Ва ўсе стравы дадавалі. Паспрабуйце надзерці хрэн на буйной тарцы і пасмажыць. Самы смачны варыянт — на топленым сметанковым масле.

**Я — фанат беларускай кухні.** Бачу за ёй вялікую перспектыву. Мне радасна, што паступова яна робіцца папулярнай і моднай. Гэта, як рэлігія. Варта адзін раз пакаштаваць сапраўды добрую беларускую кухню — і ты робішся яе адэптам.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

БЕЛАРУСБАНК

**Открытое акционерное общество**
**«Сберегательный банк «Беларусбанк»**

сообщает о проведении 7 апреля 2017 года 87-го тиража выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях в филиале №529 «Белсвязь» ОАО «АСБ Беларусбанк» по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 56 (3-й этаж, конференц-зал, комната 300).

**Начало тиража в 11.00.**
**Телефон для справок: 147 Контакт-центр.**

Сохранность и возврат вкладов гарантируются в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9 |
| **Вид аукциона** | Аукцион по комбинированной схеме (сначала на понижение, затем на повышение цены недвижимого имущества) |

**Предмет аукциона**

| Лот № | Наименование, общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| 1 | **Гараж №351,** 15,9 кв. м | 500/D-14128 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 351 |
| 2 | **Гараж №423,** 15,3 кв. м | 500/D-14180 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 423 |
| **Начальная цена с НДС 20% каждого Лота – 8 051,66 BYN** | | | **Шаг понижения цены: 402,58 BYN** |
| **Минимальная цена с НДС 20% каждого Лота – 6 038,76 BYN** | | | **Шаг повышения цены: 402,58 BYN** |
| 3 | **Гаражи на 4 автомашины,** 89,3 кв. м | 102/C-9461 | Брестская обл., Каменецкий р-н, г. Высокое, ул. Советская, д. 114 |
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок, общ. пл. 0,0245 га предоставлен Продавцу на праве аренды до 31.12.2114 для обслуживания здания гаража на 4 автомашины | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 8 875,06 BYN** | | | **Шаг понижения цены: 443,75 BYN** |
| **Минимальная цена – 7 987,56 BYN** | | | **Шаг повышения цены: 443,75 BYN** |

| Лот № | Наименование | Адрес |
|---|---|---|
| 4-13 | **Машино-место №121, №123, №127, №129, №131, №132, №133, №136, №137, №138** | г. Минск, пр-т Независимости, 168/3-1г |
| Лоты №№4–13 расположены в подземной автостоянке, общ. пл. 6299,0 кв. м с инвентарным №500/D-70793116 | | |
| **Начальная цена с НДС 20% каждого Лота – 24 057,00 BYN** | | **Шаг понижения цены: 1 202,85 BYN** |
| **Минимальная цена с НДС 20% каждого Лота – 18 042,75 BYN** | | **Шаг повышения цены: 1 202,85 BYN** |

**Срок подписания договора купли-продажи по всем Лотам: 30** рабочих дней после проведения Продавцом корпоративных процедур по согласованию заключения сделки (в случае заключения договора купли-продажи с единственным Покупателем, признанным единственным участником торгов). В ином случае – **10** рабочих дней после проведения аукциона

**Информация по внесению задатка**

**Задаток** перечисляется на р/с №3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»:
- по Лотам №№1–2 в сумме **1 515,00 BYN** по каждому Лоту.
- по Лоту №3 в сумме **1 670,00 BYN**.
- по Лотам №№4–13 в сумме **2 970,00 BYN** по каждому Лоту

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Оплата государственной пошлины за государственную регистрацию договора купли-продажи производится Покупателем. Расходы по государственной регистрации перехода прав на объект недвижимости возлагаются на Покупателя. До внесения задатка участники аукциона в обязательном порядке знакомятся с проектом договора купли-продажи

Предмет аукциона может быть снят с аукциона организатором в любое время до объявления его проданным

Предыдущее извещение о проведении аукциона по Лотам №№4–13 опубликовано в г. «Звязда» от 14.12.2016.
Предыдущее извещение о проведении аукциона по Лотам №№1–3 опубликовано в г. «Звязда» от 25.02.2017

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **17.04.2017** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **13.04.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.** **auction@cpo.by; www.cpo.by** |

## ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ»

УНП 600013209
220090, г. Минск, ул. Широкая,4

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2017 года

*тыс. руб.*

| | Наименование показателя | код строки | на начало 2016 года | на конец 2016 года |
|---|---|---|---|---|
| **АКТИВ** | | | | |
| 1. | Долгосрочные активы | 190 | 3 855 | 4 647 |
| 2. | Краткосрочные активы | 290 | 6 723 | 10 446 |
| **БАЛАНС** | | 300 | 10 578 | 15 093 |
| **ПАССИВ** | | | | |
| 3. | Капитал и резервы | 490 | 5 274 | 6 474 |
| 4. | Долгосрочные обязательства | 590 | | |
| 5. | Краткосрочные обязательства | 690 | 5 304 | 8 619 |
| БАЛАНС | | 700 | 10 578 | 15 093 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2016 год

*тыс. руб.*

| Наименование показателя | код строки | за 2016 год | за 2015 год |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ и услуг | 010 | 34 405 | 23 892 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020,040,050 | 32 428 | 24 313 |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 1 977 | -421 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 175 | 385 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | 1 199 | 121 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 953 | -157 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | 150 | -33 | 375 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 160 | 920 | 218 |
| Налог на прибыль | 170 | 259 | 47 |
